БЕЛАРУСКІ ПАНТЭОН

5

ПАМІЖ ХВАЛЯМІ ПАНДЭМІІ

8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

19 ВЕРАСНЯ 2020 г. СУБОТА

№ 183 (29297)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Трэба будаваць жыллё так, каб размеркаваць вытворчыя сілы па краіне»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на пляцоўцы ААТ «МАПІД» азнаёміўся з развіццём жыллёвага будаўніцтва ў Беларусі

Фота Belta.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз пацвердзіў сваё патрабаванне па скарачэнні жыллёвага будаўніцтва ў Мінску, каб не перанасяляць сталіцу, паведамляе афіцыйны партал кіраўніка дзяржавы. «Гэта не проста размова. Гэта возьмем на жорсткі кантроль. Трэба будаваць жыллё так, каб размеркаваць вытворчыя сілы па краіне», — сказаў Прэзідэнт.

Падчас наведвання будаўнічай кампаніі кіраўнік дзяржавы нагадаў аб неабходнасці паступова пераходзіць на выкарыстанне драўніны ў вытворчасці вокнаў і дыхадзіць ад пластыку. Гэта і больш экалагічна, і дазваляе шырэй задзейнічаць айчынную сыравіну, заўважыў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу на магчымасць больш шырокага прасоўвання беларускіх будаўнічых паслуг у Расію. Ён адзначыў, што ў Расійскай Федэрацыі цяпер актыўна рэалізуюцца розныя праекты, дзе могуць быць запатрабаваныя беларускія будаўнікі. Пра гэта ішла размова і падчас перагавораў Аляксандра Лукашэнкі з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным.

Адзін з буйных праектаў — гэта будаўніцтва касмадрома «Усходні» ў Амурскай вобласці Расіі. «Гэта вельмі добры аб'ект, і ён ім вельмі патрэбны. Яны гатовыя плаціць любыя грошы. Гэта наша перспектыва, і там трэба будаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як было даложана Прэзідэнту, ААТ «МАПІД» імкнецца пашырыць сваю прысутнасць на расійскім рынку. У прыватнасці, заключаны кантракт на будаўніцтва ў Обнінску Калужскай вобласці дзесяці жылых дамоў плошчай 70 тыс. кв. м. Вядуцца перагаворы па будаўніцтве «беларускага» квартала ў Нижнім Ноўгарадзе.

Кіраўніком дзяржавы таксама было адзначана, што бударганізацыі з уласнай вытворчай базай павінны быць загружаныя аб'ёмамі жыллёвага будаўніцтва ў першачарговым плане.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што часам мелі месца факты, калі дзяржаўныя будаўнічыя трэсты з уласнай вытворчасцю будуюць жыллё па замове прыватнікаў, і ў апошніх застаецца асноўная частка прыбытку. «Каб трэсты не былі на пабягушках у прыватнікаў, — сказаў Прэзідэнт. — З 1 студзеня наступнага года на гэтую тэму не павінна быць размоў».

Пры гэтым ён растлумачыў, што як дзяржаўныя, так і прыватныя будаўнічыя арганізацыі, якія маюць сваю вытворчую базу, павінны ў першую чаргу прыцягвацца да жыллёвага будаўніцтва. «Яны маюць загружаныя ў першачарговым плане. У адваротным выпадку, навошта яны стваралі гэтыя магутнасці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як далажыў Прэзідэнту старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў, ужо была праведзена работа па пошуку пляцовак для буйных дзяржаўных забудоўшчыкаў. «Цяпер актыўна працуем па будаўніцтве сетак. Выходзім на тое, каб з наступнага года максімальна загрузіць будаўнічыя прадпрыемствы», — сказаў ён.

Паводле яго слоў, загрузка «МАПІДа» ўжо перавышае 80 %. Неўзабаве завяршаецца мадэрнізацыя Завода эфектыўных прамысловых канструкцый, і для гэтага прадпрыемства ўжо пазначаныя пляцоўкі пад будаўніцтва з перспектывай на два гады. «Гэтыя прадпрыемствы самадастатковыя, у іх ёсць праектныя арганізацыі, яны выконваюць увесь комплекс работ, будуюць дамы практычна пад ключ з уласных матэрыялаў і з выкарыстаннем уласных працоўных сіл», — адзначыў кіраўнік Мінгарвыканкама.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу: на балансе дзяржаўных забудоўшчыкаў, у тым ліку і «МАПІДа», маюцца сацыяльныя аб'екты (інтэрнаты, дзіцячы лагер, спартыўны комплекс), якія важна захоўваць і развіваць.

Па завяршэнні наведвання прадпрыемства кіраўніку дзяржавы падарылі сертыфікат на двухпакаёвую кватэру, які ён аддаў сям'і ваеннаслужачага.

Сцяг на вышыні

60-метровы флагшток, на якім лунае дзяржаўны сцяг памерам 6 на 12 метраў, адкрылі 18 верасня ў Гомелі.

Фота Belta.

ЛІЧБА ДНЯ

27,5 МЛН

ахоўных масак складаюць дадатковыя запасы ў сістэмах «Фармацыя» і «Белмедтэхніка». У арганізацыях аховы здароўя краіны маецца ў наяўнасці 6 млн медыцынскіх масак, 1,1 млн рэспіратараў, 542,8 тыс. касцюмаў для персаналу, 92,3 тыс. супрацьчумных касцюмаў, 15,8 млн пар пальчатак, 206,6 тыс. ахоўных акуляраў. Створаны запас сродкаў індывідуальнай аховы дазваляе забяспечыць бесперапынны рэжым працы арганізацыяй аховы здароўя на працягу больш як 30 дзён. Такія ж аб'ёмы сродкаў аховы плануецца мець у наяўнасці на працягу ўсяго эпідсезона, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

Пункт на карце

ПАМІДОРНЫ КРАЙ

Каб адчуць, чым organic food адрозніваецца ад звыклых для сучаснага гараджаніна прадуктаў, дастаткова пакаштаваць памідоры ў Савічах і параўнаць іх з таматамі з гіпермаркета.

Калі з «агурочнай сталіцай» Беларусі ўсё проста і ясна — ніхто не можа аспрэчыць гэтае высокае званне Альшан, то са сталіцай «памідорнай» не ўсё так адназначна.

У апошні час так называюць гарадок Іўе на Гродзеншчыне. Але яшчэ гадоў 10—15 таму «памідорнай сталіцай» нашай краіны была вёска Савічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Туды мы і наведаліся, каб даведацца пра сакрэты мясцовага агродніцтва.

Віктар Саф'янавіч ПРАВАЛЬСКІ, адзін са старажылаў вёскі Савічы.

АБ ЗБЫЦЕ І ПАСТАЯННЫХ КЛІЕНТАХ

Зрэшты, на Брэстчыне гэты населены пункт і сёння называюць менавіта так, хоць за апошнія гады і жыхароў у Савічах стала менш, і аб'ёмы вытворчасці таматаў, адпаведна, зусім не тыя.

— У 90-я ў сезон і фуры ў Савічах загружаліся памідорамі, і грузавыя таксі з нашай вёскі на Камароўку хадзілі, — прыгадваюць тутэйшыя людзі.

СТАР. 3

Нашы каштоўнасці

ВЯРТАННЕ ТУРАЎСКАГА КРЫЖА

Артэфакт, пра аднаўленне якога шэсцьдзясят гадоў марыў знакаміты археолаг, аздоблены выказваннямі Кірылы Тураўскага.

«...Цвярдыні на гары на той стаялі. // Палацы і саборы тут былі, // Каля яе шумелі, // гаманілі хвалі...» — пісаў паэт Уладзімір Дубоўка пра старажытны Тураў. Горад, у якім па колькасці культурных каштоўнасцяў супернічае, мабыць, толькі Полацк... Прынамсі, менавіта так сцвярджаў вядомы археолаг Пётр Фёдаравіч Лысенка, з якім давялося гутарыць шэсць гадоў таму пра тураўскія славутасці. Пра незвычайныя саркафагі з чорнага каменю; першую знойдзеную на Беларусі кірылічную азбуку, выразаную на самшытавым грабеньчыку; каменныя крыжы, што паволі растуць з зямлі... Гаварылі пра Кірылу Тураўскага, які выхоўваўся ў асяродку грэчаскіх інтэлектуалаў, што ў той час жылі ў Тураве, пры двары княгіні Варвары, сястры візантыйскіх імператараў. І пра тое, колькі страчана беларускіх гісторыка-культурных каштоўнасцяў...

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Найстарэйшая жыхарка планеты перасягнула мясцовы рэкорд даўгалецця

Японцы Канэ Танака, якую ўнеслі ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самага пажылога жыхара планеты, споўнілася 117 гадоў і 260 дзён, паведаміў тэлеканал NHK. Гэта ўсеяпонскі рэкорд даўгалецця, які ўстанавіла памерлая ў пазамінулым годзе Набі Тадзіма. Канэ Танака нарадзілася 2 студзеня 1903-га. Яна любіць шакалад і газіраваныя напоі і разлічвае дажыць да 120 гадоў. Паводле апошніх дадзеных, цяпер у Японіі больш за 80 тысяч чалавек, якія пражылі больш чым сто гадоў, 88 працэнтаў з іх — жанчыны. Пры гэтым у 1963-м у Краіне ўзыходзячага сонца было ўсяго 153 чалавекі, якія перасягнулі сто гадоў, але ўжо ў 1981-м іх колькасць дасягнула тысячы, а ў 1998-м — перавысіла дзесяць тысяч.

Германія залезе ў даўгі

Найбуйнейшая эканоміка Еўропы — Германія — канчаткова адмовіцца ад палітыкі «чорнага нуля» і рэкордна залезе ў даўгі. Аб планах міністра фінансаў краіны Олафа Шольца паведаміла Reuters. Адзначаецца, што ў 2021 годзе Берлін мае намер заняць 100 мільярдаў еўра і накіруе іх на барацьбу з наступствамі пандэміі каранавіруса. Такім чынам, ранейшыя намеры па выпуску дзяржаўных аблігацый на 80 мільярдаў еўра на працягу года павялічаны на чвэрць. Нямецкая эканоміка перажывае найманцнейшы спад з 1970-х гадоў: у другім квартале яна скарацілася на 10,1 працэнта ў параўнанні з перыядам са студзеня па сакавік. Урад вымушаны запускаць маштабныя праграмы падтрымкі, накіраваныя галоўным чынам на выплату субсідый кампаніям з абавязацельствам захавання занятасці. Рэалізацыя плана па нарошчванню дзяржаўных пазычанняў будзе азначаць адмову ад палітыкі «чорнага нуля», якая практыкавалася на працягу большай частцы апошняга дзесяцігоддзя. Яна мае на ўвазе адмову ад выпуску новага дзярждоўгу і імкненне да захавання прафіцытнага бюджэту, у якім выдаткі фінансуюцца за кошт даходаў, у тым ліку за кошт падаткаў.

Ізраіль першы ў свеце ўвёў паўторны каранцін



Поўны каранцін з-за пагрозы распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі паўторна абвешчаны ў Ізраілі. Лакдаўн будзе доўжыцца тры тыдні і дзейнічаць у тым ліку падчас восеньскіх яўрэйскіх святаў, паведаміла РІА «Навіны». Адзначаецца, што ўведзены абмежаванні на перамяшчэнне: грамадзянам забаронена аддалялцца ад дома больш чым на 1000 метраў. Перавышаць адлегласць можна толькі ідучы на работу, па прадукты і лекі, тавары першай неабходнасці. Уважлівай прычынай выхаду з дому з'яўляецца таксама ўдзел у розных рэлігійных цырымоніях і абрадах. Пры гэтым забаронена хадзіць у госці, адпачываць на пляжах, збірацца кампаніямі больш за 10 чалавек у закрытых памяшканнях і больш за 20 чалавек на адкрытых прасторах. Штраф за адсутнасць маскі складае 500 шекелей (каля 146 долараў). Паводле слоў прэм'ер-міністра краіны Біньяміна Нетаньяху, у Ізраілі колькасць тых, хто захварэў на каранавірус, расце ў геаметрычнай прагрэсіі. Ён адзначыў, што нават пасля прыняцця ўсіх неабходных мер (дадання балынічных ложкаў, апаратаў ШВЛ і павелічэння колькасці ўрачоў) брыгады не спраўляюцца з ростам колькасці захварэлых.

КАРОТКА

• Традыцыйная рабочая сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з кіраўнікамі ўстаноў аховы здароўя Мінска адбылася ў чорам ў БелМАПА.

• **У будынку дзіцячага садка аграгарадка Стары Свержань абвалілося парапет і частка знадворнай сцяны. У выніку здарэння ніхто не пацярпеў.**

• Рэспубліканскі турзлёт студэнтаў пройдзе з 25 па 27 верасня ў вёсцы Жорнаўка Бярэзінскага раёна.

• **Авіякампанія «Белавія» з 20 верасня павялічыць частату рэйсаў з Мінска ў Ерэван. Зараз авіякампанія выконвае рэйсы ў Ерэван штодня. Дадатковыя рэйсы будуць выконвацца па серадах і нядзелях.**

З нагоды

У пошты — лічбавая будучыня

На працягу многіх дзесяцігоддзяў пошта асацыіравалася з традыцыйным наборам паслуг — лістамі, пасылкамі, газетамі, пенсіямі... Але сучасныя тэхналогіі ўсё больш уваходзяць у наш побыт. Працэнт пенсіянераў, якія лічаць за лепшае атрымліваць грошы на картку, а не атоўкай у паштовым аддзяленні, з кожным годам расце. Усё больш пенсій пераходзіць на карткі. Паступова знікаецца і аб'ём падпіскі на друкаванья сродкі масавай інфармацыі — як кажа генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Святлана ЮРКЕВІЧ, гэты паказчык складае прыкладна 6–7 % штогод. Наша гутарка аб сённяшнім і будучым паштовага апаратара, якому спаўняецца чвэрць стагоддзя, — з кіраўніком прадпрыемства.

СТАР. 6

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 20183

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Сёння пытанне Беларусі, Расіі і, можа быць, усёй Еўропы, не толькі Усходняй, вырашаецца тут»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 верасня выступіў на жаночым форуме «За Беларусь», які праходзіў у «Мінск-Арэне»

Гэта была незапланаваная сустрэча, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка, па яго словах, займаўся чыста мужчынскімі справамі — пытаннямі правядзення на тэрыторыі Беларусі сумесных з Расіяй ваенных вучэнняў «Славянскае брацтва — 2020», і мераваў, што не паспее на форум.

«Вырашыў хоць бы тэлеграму вам накіраваць. Потым стэлефанаваўся ў апошні раз, мне кажуць: ды не, мы яшчэ шумім! Так я прыняў рашэнне: па дарозе пераапранўся і прыехаў на гэты форум, каб сказаць вам літаральна некалькі слоў», — расказаў Прэзідэнт.

«Першае і самае галоўнае, чаму я з'явіўся тут: я вельмі цаню тое, што адбываецца цяпер у гэтай зале. Вы нават не ўяўляеце, якую яркую старонку ў гісторыі новай Беларусі вы ўпісалі гэтым дзействам, сабраўшыся з усіх куткоў нашай хай невялікай, але вельмі ўтульнай, прыгожай, цудоўнай Радзімы. Вы пішаце нашу гісторыю. І добра, што гэтая яркая, прыгожая, прынцыповая, непрадажная, сапраўдная старонка будзе прапісаная», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён распавёў удзельніцам форума аб падзеях, якія адбываюцца ў краіне і вакол яе, грамадска-палітычнай сітуацыі. «Я вам клянуся, ніякай хлусні на выбарах не было. Нельга фальсіфікаваць выбары ў 80 %», — заявіў Прэзідэнт, маючы на ўвазе падтрымку яго з боку выбаршчыкаў на сёлетніх прэзідэнцкіх выбарах.

«Ім не патрэбныя былі вынікі выбараў, — сказаў Прэзідэнт пра сваіх апанентаў, — бо да закрыцця выбарчых участкаў яны не сталі б атакаваць мірную сталіцу. За дзве з паловай гадзіны яны пачалі гэтую атаку, сабраўшыся ў абедзенны час, калі людзі ішлі на выбары. Увесь гэты дзень быў выткана з правакацый, і апошняя правакацыя — блакіраванне на 69 участках у Мінску і асобных гарадах нашай краіны ні ў чым не вінаватых людзей — членаў выбарчых участковых камісій. У асноўным там працавалі жанчыны — настаўнікі, урачы, якія выконвалі свой дзяжурны доўг».

«І мне прыйшлося загадаць арміі, каб іх эвакуіравалі на бронемашыны. Гэта непрымальна, і з гэтага ўсё пачалося. Я не мог гэтага цярпець». — патлумачыў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што тады ўсе ахнулі ў сувязі з «асіметрычным ужываннем сіл нашымі амапаўцамі, нібыта на Акрэсціна яны кагосьці паблізі». «Заяўляю вам абсалютна дасведчана, людзі гэтага не ведаюць: амапаўцы ніколі не дзяжураць, ніколі не былі ні ў СІЗА, ні на Акрэсціна. Там нясуць службу ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў. Але ўсё лязо было накіравана супраць гэтых хлопцаў, таму што яны выратавалі краіну і сарвалі бліцкрыг, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Пад гэтымі «бел-чырвона-белымі сцягамі» бліцкрыг не атрымаўся. Ён быў асуджаны за шмат гадоў. Ён не мог адбыцца ў нашай краіне. І ён не адбудзецца ніколі».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што калі не ўдалося захапіць уладу адразу — скамячыць сталіцу, падняць усю краіну, — тады па метадычцы была задзейнічана наступная хваля: «Прыгожыя дзяўчаты з белымі кветкамі, у белых сукенках, белых шаўках і без іх выйшлі на плошчы і вуліцы Мінска — прыгожага, утульнага, прыбранага горада-героя. Хацелі паказаць, што яны мірныя людзі. Пасля таго, калі іх спынілі на вуліцах і плошчах. І гэта не прайшло».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не хоча сказаць, што дзяўчаты і жанчыны, якія ўдзельнічалі ў гэтых акцыях, дрэнныя. «Не, гэта нашы дзяўчаткі, якія стаялі на вуліцах. Яны апамятаюцца. Многія ўжо выразумелі дзейнічаць. Акрамя іх яшчэ ёсць вы, якія прыехалі сёння і сказалі свае словы», — заўважыў Прэзідэнт.

Ён працягнуў: калі не атрымаўся згаданы чарговы этап, тады на згасанні пратэснага руху, каб яго неяк адрадзіць, пачалі правакаваць. «Усе разлічвалі, што мы адкажам, і адкажам жорстка. Усе рынуліся да Палаца Незалежнасці. Трэба было яго ўзяць штурмам. Не ўдалося. Праваліўся і гэты этап. Мы трывалі», — сказаў Прэзідэнт.

Тады, паводле яго слоў, быў далучаны наступны этап — жорсткі знешні палітычны і дыпламатычны ціск. «Суседнія краіны адмаўляюцца прызнаваць вынікі выбараў і па венесуэльскім сцэнарыі знайшлі беларускую «гуайдзіху» (гаворка пра экс-кандыдата ў прэзідэнты Святлану Ціханоўскую, якую Аляксандр Лукашэнка параўнаў з самаабвешчаным кіраўніком Венесуэлы Хуанам Гуайдо, якога ў такой якасці не прызнае пераважная большасць краін, уключаючы Беларусь. — Заўвага прэс-службы Прэзідэнта.) і абвясцілі не прэзідэнтам, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І вы паглядзіце, як эстафету перадалі ад Літвы ў Польшчу, ад Польшчы — ва Украіну. І тут не атрымалася».

«Сёння падключылі яшчэ адну, як яны лічаць, «тэрмаядзерную бомбу». Узарвалі ў Бруселі, у сталіцах. Ёўрапарламент, не тое Ёўрасавет, падключыўся да гэтага і таксама не прызнаў нашы выбары. На гэты конт хачу сказаць наступнае: мы правялі выбары паводле Канстытуцыі і законаў нашай краіны. Мы не маем патрэбу ні ў якім прызнанні. Выбары адбыліся, і яны законныя», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Шчыра вам скажу, мы не ведаем, што яны выкінуць далей. Мы разумеем, што ў іх арсенале засталося зусім няшмат прыёмаў, перш чым развязаць «гарачую вайну». Таму ***мы вымушаны адвесці войскі з вуліц, як я ўжо казаў, палову арміі паставіць пад ружжо і закрыць дзяржаўную граніцу з захаду, перш за ўсё з Літвой і Польшчай. Мы вымушаны ўзмацніць дзяржаўную граніцу, на вялікі жаль, з нашай брацкай Украінай».*** — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Я мушу ў апошнія дні разам з Прэзідэнтам Расіі, міністрам абароны адбудаваць агульную абарону Саюзнай дзяржавы. І мы актывізавалі даўно запланаванае ваеннае вучэнне, якое праходзіць сёння на захадзе нашай краіны — «Славянскае брацтва — 2020». А таксама намі прынята рашэнне, каб правесці гэтыя вучэнні ў сувязі з вострай сітуацыяй у дзве этапы. І другі этап, як я прасіў агучыць у тэлеграме, будзе прысвечаны вам — нашым жанчынам», — дадаў Прэзідэнт.

«Ведаеце, што я не агрэсар, я вельмі мірны чалавек. Я вырас у вёсцы, дзе кожны абараняў адзін аднаго, дапамагаў, як мог. Я стараўся ў нашай краіне зрабіць так, каб мы ўсе былі сябрамі, каб мы дапамагалі адзін аднаму, каб рупіліся адзін пра аднаго. Я быў катэгарычна супраць, каб сёння ў нашы дварэ ў Мінску прыйшла гэтая бяда. Яны яе хочуць кінуць у нашы кватэры, — сказаў Прэзідэнт. — ***Я не хачу, каб наша краіна ваявала. Тым больш я не хачу, каб Беларусь і тая ж Польшча, Літва ператварыліся ў тэатр ваенных дзеянняў, дзе будуць вырашацца не нашы пытанні.*** Таму я сёння перад гэтай залай самых прыгожых, прасунутых, патрыятычных людзей хачу звярнуцца да народаў Літвы, Польшчы і Украіны: спыніце сваіх вар'ятаў-палітыкаў, не дайце развязацца вайне!»

«Паверце, сітуацыя вельмі няпростая. І я яе не хачу ўскладняць. Мы мужыкі, і мы вырашым гэту праблему», — запэўніў беларускі лідар.

Да жанчын і дзяўчат Аляксандр Лукашэнка звярнуўся з просьбай: «Вы вернецеся дадому. Скажыце дома, у кожнай вёсачцы, у горадзе, вялікім і малым, скажыце людзям пра тое, што адбываецца на самай справе. Сёння пытанне Беларусі, Расіі і, можа быць, усёй Еўропы, не толькі Усходняй, вырашаецца тут. Нельга давесці да «гарачай вайны», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Я толькі што сказаў: у іх арсенале засталося зусім няшмат прыёмаў. ***І мы стаім на мяжы страшнай катастрофы. Калі яны сунуцца сюды, мы вымушаны будзем адказваць. Мы не станем на калені. Нават калі застанемся адны».*** — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы вельмі правільна сказалі — мы ўпершыню ў шматвяковай, тысячагадовай гісторыі нашага старажытнага народа атрымалі гэты суверэнітэт і гэтую незалежнасць. Я аддаю сабе справаздачу, што мы небагата жывём. Але мы ж не жабракі. Таму што ў нас ёсць гэтая краіна. ***Калі мы зараз дрогнем і аддадзім гэты кавалак зямлі, загінем не толькі мы, загінуць нашы дзеці і ўнукі. Таму вы маеце рацыю: Беларусь мы не аддадзім!*** Таму што мы не любім, а любімую не аддаюць!» — паўтарыў ён фразу, якая ўжо стала афарызмам.

Фота БелТА.

Парламенцкі дзённік

«Яркі прыклад катэгарычнасці і палітычнай высакамернасці»

Так назваў рэзалюцыю па Беларусі, якая была прынятая Ёўрапарламентам 17 верасня, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ. Учора ён з гэтай нагоды, а таксама ў сувязі з заявай Вярхоўнай Рады Украіны адносна нашай краіны, выступіў з заявай для прэсы.

«Рэзалюцыя Ёўрапейскага парламента з'яўляецца яркім прыкладам катэгарычнасці, тэндэнцыйнасці і палітычнай высакамернасці, — сказаў старшыня парламенцкай камісіі. — Сумна асэнсоўваць, што практыка прадуманых і ўзважаных дзеянняў, якія накіраваны на ўмацаванне даверу і бяспекі ў Ёўропе, саступае месца банальнаму палітыканству. Мы разглядаем гэтую тэндэнцыю як відавочную праяву сістэмнага крызісу, у якім знаходзяцца ўсе ёўрапейскія інстытуты».

Адносна заявы Вярхоўнай Рады Украіны дэпутат адзначыў, што «ўкраінскі народ з'яўляецца брацкім народам, з якім нас звязваюць непарыўная дружба, кроўныя вузы і стагоддзі гісторыі».

«На гэтым фоне пазіцыя Вярхоўнай Рады Украіны наглядна дэманструе глыбіню выраджэння палітычнага інстытута, які знаходзіцца пад знешнім кіраўніцтвам і ігнаруе нацыянальныя інстытуты ўласнай краіны, — заявіў парламентарый. — Гэта толькі ўмацоўвае трывалась беларускіх палітычных інстытутаў у іх супрацьстаянні знешнім сілам, якія бесцырымонна парушаюць наш суверэнітэт і права на выбар самастойнага шляху развіцця».

Тэндэнцыйны палітызаваны характар рэзалюцыі Ёўрапейскага парламента ў сітуацыі ў Беларусі адзначыў і Прэзідыум Савета Рэспублікі. У адпаведнай заяве верхняй палаты беларускага парламента рэзалюцыя названа адкрытым умяшаннем ва ўнутраныя справы краіны.

«Падкрэсліваем, што беларускі народ самастойна разбярэцца з усімі пытаннямі ўнутранага жыцця сваёй краіны, прадоўжыць працаваць над эвалюцыйным развіццём эканомікі, палітычнай сістэмы, сацыяльнай і гуманітарнай сфер. Мы гатовыя пашырацца узаемадзеянне з нашымі ёўрапейскімі партнёрамі, ухіляючыся парламентарыяў, для будзем рабіць гэта на роўнай і ўзаемапавяжлівай аснове», — сказана ў заяве Прэзідыума Савета Рэспублікі.

Як паведамлялася, 17 верасня ёўрапарламентарыі прагаласавалі за прынятыя праекта рэзалюцыі, у якой аспрэчваюцца вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Аналагічны дакумент быў прыняты Вярхоўнай Радай Украіны 15 верасня.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Слова — чытачам «Звязды»

«Газета застаецца адданай роднай мове»

Дзяніс ДУК, рэктар Магілёўскага Дзяржуніверсітэта імя Аркадзя Куляшова:

— Маё знаёмства са «Звяздой» адбылося ў 90-я гады, калі мой бацька выпісваў яе. Гэта адно з нешматлікіх беларускіх выданняў, якое і цяпер не здраджвае сабе і падае навіны менавіта на роднай мове. Гэта вельмі каштоўная традыцыя. Мне падабаюцца «круглыя сталы», якія робіць газета, і я таксама ў іх удзельнічаў. Сёлета, напрыклад, быў «круглы стол», прысвечаны захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, удзел у якім бралі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук, нашай установы як своеасаблівага цэнтра па археалагічных даследаваннях.

Мяне як чытача заўсёды цікавіць добрая, змястоўная аналітыка — думкі, разважанні наконт усіх падзей грамадска-палітычнага жыцця нашых вядучых вучоных, парламентарыяў, прадстаўнікоў розных галін дзейнасці. Чым больш будзе такіх разважанняў, падмацаваных фактамі, тым лепш.

Сёння шмат розных меркаванняў, але ў іх мне не вельмі падабаецца палярызацыя думак. Мы ведаем, што ў любым працэсе ёсць станоўчыя і адмоўныя бакі. І вельмі важна бачыць тое станоўчае, што ёсць сёння і было ўчора. Гэта можна зрабіць, калі мы абстрагуемся ад эмоцый. Толькі тады можна будзе ацаніць сітуацыю цвяроза. А калі чалавек падвергнуты нейкім эмацыйным успрыманню, зрабіць гэта немагчыма.

І самае каштоўнае, што заўсёды вылучала «Звязду», — гэта тое, што ў ёй магчыма сустрэць розныя меркаванні, але не натрапіць на нейкі там эмацыянальны пасыл. Апошнія сёння ў свеце зашмат. Асабліва ў інтэрнэце. А вось газета — гэта якраз тая пляцоўка, дзе акрамя навін падаюцца меркаванні наконт тых ці іншых падзей — вострых, праблемных, але ўзважана і грунтоўна, як і павінна быць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Ведай сваё

КАРТА ПАДКАЖА

Інфармацыя аб паходжанні назваў вуліц краіны стала даступнай карыстальнікам публічнай кадастравай карты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Звесткі, якія адлюстроўваюцца на карце, сабраныя ў афіцыйных крыніцах. З яе дапамогай можна даведацца больш пра гістарычных асоб, значныя даты і падзеі, памятныя мясціны, а таксама цікавыя факты, з якімі звязаныя назвы элементаў вулічна-дарожнай сеткі населеных пунктаў Беларусі.

На збор, апрацоўку і публікацыю такой інфармацыі для новага праекта Нацыянальнаму кадастраваму агенцтву і тэрытарыяльным арганізацыям па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру Дзяржкаммаёмасці спатрэбілася менш за паўгода. Вялікую дапамогу прыслі зборы даных для рэестра найменняў вуліц і дарог дзяржаўнага зямельнага кадастру аказалі мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

Дадатковы станоўчы аспект праекта па збору такой інфармацыі — яе аднаўленне і ўдакладненне. Так, напрыклад, доўгі час у горадзе Рэчыца існавалі вуліца і завулак Міцкевіча, якія пасля атрымалі назву Адама Міцкевіча. Але пры зборы інфармацыі высветлілася, што гэтыя элементы вулічна-дарожнай сеткі першапачаткова атрымалі назву не ў гонар знакамітага пісьменніка, а ў гонар савецкага разведчыка — Яўгена Міцкевіча. Гэта адлюстравана ў кадастравых даных і паказана на карце ў адпаведнасці з рэестрам.

Практычна ўсе найменні элементаў вулічна-дарожнай сеткі маюць цесную сувязь з мясцінамі, дзе гэтыя элементы знаходзяцца. Так, у вёсцы Копішча Бараўлянскага Сельскага савета Мінскага раёна раней размяшчаўся цэнтральны аэраклуб ДТСААФ, а сёння многія вуліцы носяць назвы вядомых лётчыкаў і авіяканструктараў.

На цяперашні момант на карце паказаны 53 тысячы элементаў вулічна-дарожнай сеткі ў розных населеных пунктах Беларусі. Больш за восем тысяч з іх утрымлівае інфармацыю аб паходжанні таго ці іншага найменя.

Каб атрымаць звесткі пра вуліцу, неабходна зайсці на сайт карты (http://map.nca.by/) і клікнуць па аб'екту, які цікавіць.

Работа па зборы інфармацыі працягваецца. Зацікаўленыя асобы могуць скарыстацца формай зваротнай сувязі на публічнай карце і даслаць інфармацыю аб паходжанні назвы вуліцы са спасылкай на крыніцу, адкуль узяты дадзеныя.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

САА3 паставіла ў Беларусь 250 кіслародных канцэнтратараў

Краінавы офіс Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі перадаў сістэме аховы здароўя нашай краіны 250 кіслародных канцэнтратараў.

Планаецца, што дастаўленае абсталяванне ад вядучага сусветнага вытворцы будзе задзейнічана ў рэспубліканскім рэзерве падчас чаканай у асенне-зімовы перыяд другой хвалі захворвання на COVID-19 і будзе размяркоўвацца Рэспубліканскім цэнтрам арганізацыі медыцынскага рэагавання ў тыя медустановы краіны, дзе найбольш спатрэбіцца дадатковая кіслародная падтрымка пацыентаў.

Закупленыя кіслародныя канцэнтратары цалкам адпавядаюць усім патрабаванням Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Дадзенае абсталяванне для кіслародной тэрапіі жыццёва неабходна захворвшым на COVID-19 сярэдняй і высокай ступені цяжкасці са зніжанай з прычыны каранавіруснай інфекцыі кіслародной сатурацыяй.

Прыняцце работы канцэнтратара заключаецца ў генерацыі кісларод з пакаёвага паветра і дастаўцы яго пацыенту праз назальныя катэтары. Кіслародныя канцэнтратары цалкам аўтаномныя і з'яўляюцца важнай крыніцай кісларод пацыентаў з панікамыі паказчыкамі насычэння крыві кіслародам. Яны абсталяваныя бактэрыяльным фільтрам, валодаюць прадукцыйнасцю восем літраў у хвіліну і канцэнтрацыяй кісларод у сумесі больш за 90 %. Таксама яны могуць выкарыстоўвацца для двух пацыентаў адначасова.

Абсталяванне на агульную суму $211 000 было пастаўлена ў рамках праекта «Падтрымка гатоўнасці САА3 і мер у адказ для барацьбы з пандэміяй COVID-19», што фінансуецца Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці (USAID).

Па дадзеных Міністэрства аховы здароўя, на 18 верасня ў Беларусі зарэгістравана 75 230 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. За апошнія суткі захварэла 243 чалавекі. Ужо трэці дзень колькасць новых выпадкаў перавышае дзве сотні. Паправіліся і выпісаны 73 098 пацыентаў (131 за апошнія суткі), 773 чалавек з пачатку распаўсюджання ў краіне каранавірусная інфекцыі выратаваць не ўдалося (двое памерлі за апошнія суткі). Усяго з канца лютага праведзены 1 700 790 тэстаў (14 572 за апошнія суткі).

Алена КРАВЕЦ.

Фінансавы выдатнік

Калі за перамогу ў конкурсе грошы даюць

Нацыянальны банк нашай краіны абвясціў аб правядзенні конкурсу на найлепшую работу па эканамічнай тэматыцы. Гэта мерапрыемства праводзіцца ў дзвюх намінацыях: конкурсныя работы студэнтаў і магістрантаў і работы аспірантаў.

Як адзначылі ў прэс-службе Нацбанка, галоўны прыз у кожнай намінацыі — грашовая прэмія ў памеры 1000 беларускіх рублёў. Таксама грашовымі прэміямі ў кожнай з катэгорый будуць адзначаны конкурсныя работы, якія занялі другое і трэцяе месцы, — 700 і 500 беларускіх рублёў адпаведна.

У конкурсе могуць прыняць удзел (як індывідуальна, так і ў складзе калектываў) студэнты, магістранты і аспіранты ўстаноў вышэйшай адукацыі і арганізацый, якія рэалізуюць пасля ВНУ адукацыйныя праграмы.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 30 кастрычніка накіраваць на электронны адрас konkurs@nbrb.by адпаведную заяўку і сваю конкурсную работу. Пераможцы і прызёры будуць абвешчаныя не пазней за 30 снежня гэтага года. Падрабязная інфармацыя аб конкурсе (тэрміны і парадак яго правядзення, а таксама патрабаванні, якія прад'яўляюцца да ўдзельнікаў і іх работ) размешчаны на Адзіным партале фінансавай пісьменнасці.

Сяргей КУРКАЧ.

Ураджай

Будзем з хлебам і гародніной

А ЯШЧЭ Ў НАС ЗНАЧНЫ ПЛЮС ПА МАЛАЦЭ І МЯСЕ

Як паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, у студзені—жніўні ў гаспадарках усіх катэгорый (у сельскагаспадарчых арганізацыях, фермерскіх гаспадарках, у насельніцтва) вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў бягучых цэнах склала 13,3 млрд рублёў і павялічылася ў параўнанні з мінулым годам у супастаўных цэнах на 7,9 %.

У сельскагаспадарчых арганізацыях выраблена прадукцыі на 12,1 млрд рублёў, або ў супастаўных цэнах на 9,6 % больш, чым у адпаведным перыядзе папярэдняга года. У гаспадарках усіх катэгорый выраблена (вырашчана) жывёлы і птушкі (у жывой вазе) 1245 тысяч тон, што на 4,8 % больш, чым за восем месяцаў мінулага года, малака выраблена 5256,8 тысяч тон (на 5,3 % больш).

На стане на 1 верасня ў сельскагаспадарчых арганізацыях колькасць буйной рагатай жывёлы склала 4,2 млн галоў, у тым ліку кароў — 1,4 млн галоў (на 0,3 % больш). Колькасць свіней склала 2,6 млн галоў, што на 2,9 % больш, чым на адпаведную дату папярэдняга года.

Таксама варта адзначыць, што на названую дату ў сельскагаспадарчых арганізацыях збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы) скошаны з 95,8 % плошчаў, якія падлягаюць уборцы. Усяго намалочана збожжа ў першапачатковага апрыходаванай вазе 7,7 млн тон, або 119,3 % да адпаведнай даты папярэдняга года, пры сярэдняй ураджайнасці 37,2 цэнтнера з аднаго гектара ўбраной плошчы (на 1 верасня 2019 года — адпаведна 31,2 цэнтнера).

Спецыялісты Белстата адзначаюць, што ў краіне працягваюцца работы па нарыхтоўцы кармоў. На пачатак восені ў сельскагаспадарчых арганізацыях нарыхтавана кармоў 8,1 млн тон кармавых адзінак, або на 21,2 % больш, чым летась, з іх кармоў з травы — 4,5 млн тон (120,7 %). У разліку на ўмоўную галаву для грамадскага пагалоўя жывёлы кармоў нарыхтавана 18,5 цэнтнера кармавых адзінак, што на 20,9 % больш, чым на адпаведную дату мінулага года, з іх кармоў з траў — 14,1 цэнтнера (на 21,6 % больш).

Сяргей КУРКАЧ.

ВЯРТАННЕ ТУРАЎСКАГА КРЫЖА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас размовы слынны гісторык дастаў з шафы незвычайны металічны крыж — рэканструкцыю, якую калісьці зрабіў сам разам з сынам Фёдарам, тады яшчэ школьнікам. На крыжы я пабачыла чатыры відавочна старажытныя абразкі... Іх Пётр Фёдаравіч знайшоў у 1962 годзе падчас раскопак Тураўскага гарадзішча на слаі XII—XIII стст. і вызначыў як часткі напрастольнага крыжа Тураўскага епіскапальнага храма. Гісторык марыў, каб калі-небудзь гэты крыж быў узноўлены, падобна да крыжа Ефрасінні Полацкай.



Што ж, часам беларускія артэфакты вяртаюцца на Радзіму. Раптам у Лондане знаходзіцца асобнік першага беларускага буквара, у вёсцы Вішнева на Смаргоншчыне — карціна славутага Яна Дамеля, выявіцца ў якімсьці архіве новы рукапіс Максіма Багдановіча, Уладзіміра Дубоўкі... Нават калі каштоўнасць знішчана — неабыякавыя людзі адновяць яе.

Здэйснілася і мара Пятра Фёдаравіча... Шкада, ён не дажыў да гэтага ўсяго некалькі месяцаў. Але быў на пасяджэннях, дзе абмяркоўваўся праект, і не выказваўся супраць эскіза крыжа — так сцвярджае старшыня Сінадальнага аддзела па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі Беларускай праваслаўнай царквы Марыя Нецвятаева, якая была прызначана куратарам работ па адноўленні Тураўскага крыжа і з'яўляецца аўтарам яго канцэпцыі. На аб'яўлены ў 2018 годзе конкурс эскізаў было прадстаўлена дзевяць прац.

— Мы хацелі зрабіць конкурс максімальна незалежным, прасіць падаваліся пад нумарамі, — тлумачыць Марыя Валянцінаўна. — У журы пад старшынствам мітрапаліта Паўла ўваходзілі прадстаўнікі Акадэміі мастацтваў і Акадэміі навук. Былі адзначаныя тры праекты. Першае месца заняў эскіз Алены Андрушчанкі, другое і трэцяе месцы — праекты аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам Ігара Гардзіенка і скульптара Андрэя Хацяноўскага. Было прынята рашэнне зрабіць два крыжы: каб адзін быў у царкве, другі — у Акадэміі навук.

— Які з іх упрыгожваюць абразкі, знойдзеныя Пятром Фёдаравічам?

— Перанесці абразкі на крыж не ўдалося, бо ўсе рэчы навукоўца падасце ягонага жадання перадаюцца ў Нацыянальны гістарычны музей. Але іх адналіпі на сярэдневяковай тэхналогіі.

— Чула спрэчкі: ці сапраўды знойдзеныя абразкі былі часткай напрастольнага крыжа?

— Гэта гіпотэза, але яна мае абгрунтаванне. Ва ўсім свеце норма — рэканструяваць артэфакты па фрагментах, ведаючы характэрныя рысы культуры эпохі і рэгіёна. Пётр Фёдаравіч таксама абапіраўся на свае веды. Абразкі, знойдзеныя ім, не былі падпісаныя. Гэта значыла, што яны — частка нечага, падпісы засталіся на той рэчы, да якой яны былі прымацаваныя. Пра што сведчыў і звароты іх бок — пляскаты. Памеры казалі, што гэта быў крыж — толькі для яго ў той час марылі рабіцца абразкі такога памеру. А памер усяго крыжа заклаў Пётр Фёдаравіч: 52 сантыметры. Вядома, нідзе не напісана, што напрастольны крыж павінен быць менавіта такой даўжыні, але мы зноў жа абапіраліся на традыцыю, якая была ў канцы XII — пачатку XIII стагоддзя.

— Пётр Фёдаравіч казаў пра візантыйскі ўплыў, які існаваў тады ў Тураве дзякуючы княгіні Варвары. У Тураўскім крыжы ён таксама прасочваецца?

— Мы не хацелі, каб крыж быў зроблены «пад Візантыю» ці пад нейкую готыку. Мы ставілі ўмову, каб гэта была менавіта беларуская нацыянальная святыня. Так, я заўважала ў тых жа казаннях Кірылы Тураўскага калькі з візантыйскай культуры, але ў іх шмат свайго, самабытнага. Старажытны Тураў быў вельмі важны і для Захаду. Сказаць, што горад быў чыста пад візантыйскім уплывам, нельга. І калі мітраліт Веньямін прымаў узноўленыя крыжы, многія выказваліся, што гэта самабытны беларускі артэфакт.

— Вядома, напрошваецца аналогія з крыжом Ефрасінні Полацкай...

— Так, крыж Ефрасінні сапраўды паўплываў на канцэпцыю Тураўскага крыжа. Полацкі крыж — гэта думкі пра сям'ю, там ёсць выявы святых апекуноў бацькоў Ефрасінні. Канцэпцыя Тураўскага крыжа нараджалася ў мяне доўга і пакутліва. Толькі калі мы з маім мужам, святаром, паехалі ў Пінск на злёт моладзі і я наведала свой улюбёны Музей Беларускага Палесся, а потым паблукала па Пінску і Тураве, усё склалася. Вонкавы бок крыжа — гэта светабудова. Моманты Распяцця. Наверсе — смарагд. У цэнтры няма выявы Госпада, але зэзе рубін, як у старажытнасці казалі, лал. Гэта і ёсць адсылка да Цела і Крыві Гасподніх. Мы абапіраліся на багаслоўскі кантэкст — XII стагоддзе напоўненае спрэчкамі пра Ахвяру Гасподнюю і цялеснасць Хрыста. Збоку — выявы Божае Маці і Іаана Багаслова. Ніжэй — Кірылы Тураўскага. А вось з наступным абразком звязаныя самыя вялікія спрэчкі. Таму што Пётр Фёдаравіч атрыбуіраваў яго як выяву прападобнай. Але такое адзенне на той час не магло быць адзненнем схімніцы. Пошукі, параўнанні заседчылі, што гэта вопратка князя. Я прыйшла да высновы, што на абразку — Андрэй Багалюбскі, які быў і князем тураўскім, і князем кіеўскім, яго забойства стала сенсацыяй таго часу. Яшчэ адна выява — мучаніца Варвара, апякунка тураўскай княгіні Варвары. Такім чынам выбудоўваецца іерархія: свяціцель — князь — мітраніх. На зваротным баку — свая гісторыя. Заказчыкам крыжа мог быць князь тураўскі Глеб, які ў хрышчэнні стаў Міхаілам, таму — выява архангела Міхаіла. І мы не маглі забыць пра дзвюх персон, без якіх крыж не быў бы адноўлены: Пятра Лысенку і мітрапаліта Паўла, і змясцілі выяву святых Пятра і Паўла. А з бакоў крыжа вельмі важная дэталь, якая ўсё звязвае: выказванне Кірылы Тураўскага пра крыж.

— Што ж, два залатыя тураўскія крыжы зроблены. А калі і дзе можна будзе іх пабачыць?

— 26 верасня, на свята Узнясення Крыжа Гасподняга, падчас вячэрняй службы ў Мінскім кафедральным саборы, Тураўскі крыж будзе ўпершыню прадстаўлены людзям. Пасля свята крыж будзе экспанаваца ў Царкоўна-гістарычным музеі Беларускай Праваслаўнай Царквы. У Тураў яго прынясуць у дзень памяці святога Кірылы Тураўскага, 11 мая 2021 года.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Меркаванне

«ГАНАРУСЯ МІРАЛЮБНАСЦЮ БЕЛАРУСІ...»

Каміль КАМАЛ — беларускі мастак азербайджанскага паходжання. Доўгія дзесяцігоддзі жыве і працуе ў Беларусі. Пра сённяшнюю грамадскую, сацыяльную сітуацыю — наша размова з таленавітым творцам.

— Які настрой сёння, спадар Камал?

— Вуліца, тое, што адбываецца вакол, напружае. І часам гэтыя падзеі займаюць шмат часу для развагі і асэнсавання. Мяне хвалюе найперш тое, што чалавек, паддаўшыся настрою натоўпу, губляе сябе як асобу, як адзінку-індывідуальнасць. Мне, творчаму чалавеку, не зразумець, чаму так лёгка знікаюць адметнасці культурнай сутнасці грамадства...

— Вы нарадзіліся на Каўказе, параўноўваеце традыцыі сваёй старонкі з Беларуссю?

— Я нарадзіўся ў Грузіі. У азербайджанскай сям'і. Заўважу, у вялікай сялянскай сям'і. Мастацкае вучылішча скончыў у Баку. Вучыўся ў Ленінградзе. Дарэчы, адным з маіх настаўнікаў быў ураджэнец Гомельшчыны, мястэчка Уваравічы, — народны мастак СССР Яўсей Майсеенка. Жыў у Кіеве. І атрымаў вышэйшую творчую адукацыю ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Галоўнымі сваімі настаўнікамі лічу Анатоля Бараноўскага і Гаўрыіла Вашчанку. Іх урокі заўсёды ў майй памяці. Прыехаўшы шмат гадоў таму ў Мінск, я ўсім сэрцам палюбіў Беларусь.

Тут я сустрэў жонку, вырасціў сына, займеў шмат сяброў. У Мінску, у Беларусі жыве шмат маіх суайчыннікаў. І кожны з іх знайшоў сваё месца.

Маючы досвед жыцця ў іншых кутках былога Савецкага Саюза, ведаючы пра тое, што адбываецца сёння на Каўказе, я ўсё яшчэ — і ў сталыя свае гады — жыву пітэтам перад народам Беларусі. Мне здаецца, што няма лепшай краіны для жыцця, чым Беларусь. І як гэта можна не адчуваць? Як гэта можна не разумець? Беларусы — самыя вялікія інтэрнацыяналісты. Мне падаецца, што такімі яны былі і застануцца праз усе стагоддзі.

Беларусы заўсёды ўражвалі мяне стрыманасцю, спакоем... І мо ўсё ж варта і зараз спакойна агледзецца, разабрацца ў тым, што здарылася, і самім, без чужых падказак, усё вырашыць?

А што да традыцый, то, канешне ж, менавіта ў Беларусі традыцыі міралюбнасці, спагадлівага стаўлення да чалавека вышэй, чым дзе-небудзь яшчэ. Асабліва сёння, калі то тут, то там народы сутыкаюцца ў крывавых разборках, губляюць свой твар, свой нацыянальны характар, часам нямеведама што адстойваючы...

— І ўсё ж такі, што зараз у вашых творчых планах?

— Шмат часу аддаючы жывапісу, скульптуры, у апошнія гады я ўспомніў і сваё дачыненне да графікі. Найбольшую ўвагу скіраваў на кніжную графіку. Як вынік — афармленне цэлай серыі кніг паэзіі народаў Усходу, беларускіх паэтаў. У Выдавецкім доме «Звязда», у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшлі кнігі вершаў кітайскага паэта Ай Ціна, паэта і мысляра з Бангладэш Казі Назрула Іслама ў перакладзе на беларускую мову, некалькі зборнікаў у серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», кнігі Ганада Чарказяна, Юлія Алейчанкі. Мне вельмі прыемна, што некаторыя з гэтых выданняў адзначаны на конкурсе «Мастацтва кнігі». Дарэчы, і на конкурсе «Мастацтва кнігі СНД». Вельмі ўдзячны і выдаўцам, і паліграфістам, што супольна мы ажыццявілі такія выдатныя кніжныя праекты, здолелі данесці пісьменніцкія здабыткі да чытача ў цікавым афармленні, выдатным паліграфічным выкананні.



Фота Яна ХВЕДЬКІНА.

А цяпер я вырашыў аддаць даніну павазе свайму добраму сябру, якога ўжо няма сярод нас, — народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну. Мы часта сустракаліся. Тады я напісаў некалькі яго партрэтаў. Цяпер жа выканаў больш як тры дзясяткі графічных партрэтаў геніяльнага беларускага творцы.

— Такая праца сапраўды ўражвае!..

— І я не чакаў, што хопіць сіл на такое шматаблічнае асэнсаванне адной постаці. Але я многа чытаў яго кніг, сабраў багаты ілюстрацыйны матэрыял, звязаны з паэтам і яго жыццём. Успомніў усе тыя сустрэчы, успомніў сеансы, калі ён пазіраваў мне ў час работы над жывапіснымі партрэтамі...

— Ці збіраецеся прадстаўляць гледачу гэтую графіку на тэму «Рыгор Барадулін»?

— Ёсць дамоўленасць з адным кніжным выдавецтвам пра выданне кнігі перакладаў Рыгора Іваналіча, а як ілюстрацыі да гэтага зборніка будуць выкарыстаны зробленыя мной партрэты, малюнкі... Барадулін шмат перакладаў і з азербайджанскай, каўказскай паэзіі. Мяркую, што кніга стане своеасаблівым унёскам у дружбу, яднанне, стане праявай міралюбівых памкненняў маёй роднай краіны — Рэспублікі Беларусь, грамадзянінам якой я з'яўляюся. І чым вельмі ганаруся!..

Гутарыў Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.

ПАМІДОРНЫ КРАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер у асноўным збытам памідорнай прадукцыі савіцкія «фермеры» займаюцца самі. У каго ёсць машыны, возяць памідоры на рынак — у асноўным у Баранавічы, але часам і ў Брэст, і ў Мінск. А часцей — проста выносяць за вакол ічу вёдры і скрыні і чакаюць пакупнікоў. У сезон такія міні-гандлёвыя пункты ёсць практычна каля кожнага жылога дома ў вёсцы.

— Мы сабе 200 кустоў насадзілі — і паесці, і на продаж. Больш не хачу: збыту няма. Раней і па тры тысячы кустоў садзілі, і больш. Але ў апошні час спажыўкааперацыя моцна апусціла цэны на закупку. Яблыкі па 15 капеек прымаюць, памідоры — па трыццаць, здаецца. Я дакладна не ведаю, бо мы не здаём, толькі прадаём вось так, каля дома. Такі адпачынак, па-старэчы. Як на рыбалцы: сядзі сабе і чакай, калі клюне, — распавядае Віктар Пральскі, адзін з жыхароў вёскі.

Наладзіць збыт, які быў яшчэ гадоў 15 таму, сёння не ўяўляецца магчымым, наракае суразмоўца.

— Вёска пустая, хто памёр, хто з'ехаў. Раней, бывала, ідзеш па вёсцы ўвечары — у кожным акне свята-ло. А цяпер палова вокнаў цёмныя. Дачнікі? Не, не купляюць тут дамы. Яны аддаюць перавагу вёскам, што бліжэй да гарадоў.

Віктар Сафʼянавіч — старажыл Савічаў. Памятае, як пачынаўся тут «памідорны бізнес».

— Тут у нас адзін, Юзік Суджыц яго звалі, усё гэта пачаў — і пайшло. Тады ў нас асфальту яшчэ не было, памідоры вазілі ў Пагаральцы і грузілі на цягнік... У Мінску памідоры цяпер танней, чым па два рублі за кіло, не знойдзеш. Калі аб'ёмы вялікія — гандляваць было б выгадна і заразз.

У сезон памідоры прадаюцца практычна каля кожнага жылога дома ў Савічах.

У нашы дні зарабіць у вяскоўцаў атрымліваецца толькі на ранніх і на позніх памідорах. Улетку таматы з'яўляюцца тут раней, чым у наваколлі, ужо ў першых чыслах ліпеня. У гэтым годзе іх прадавалі ў сярэднім па два—два з паловай рублі, і гандаль у вёсцы ішоў бойкі — за першымі памідорамі прыязджалі і з суседніх вёсак, і гараджане. У сезон сярэдняя цана на кіларгам памідораў у Савічах — рубель. Вялікія і прыгожыя прадаюць па рубель трыццаць—рубель сорак. Гаспадары не скнарнічаюць і ад душы дадаюць пакупнікам прыгожы жоўты або маліновы таматы проста так, бясплатна: «Пакаштуйце, гэта грунтавы!»

Нядзіўна, што ў многіх прадаўцоў у Савічах ёсць пастаянныя кліенты.

— Мы любім «чорныя» памідоры, і купляем іх менавіта тут, — распавядае адна з пакупніц, жыхарка Баранавічаў. — Кожны раз, калі едзем на дачу альбо з дачы, спыняемся ў Савічах. Вядома, можна купіць памідоры і на рынку. Але рынак ёсць рынак: незразумела, як вырошчвалі таматы, чым падкормлівалі. А тут — усё натуральнае, чыстае, для сябе вырашчана, таму памідоры такія смачныя.

Чорныя, дарэчы, на гэты раз у прадаўца ўжо няма: усё, што саспела, забралі папярэднія пакупнікі.

— Ёсць у нас пастаянныя пакупнік, які кожны год восенню прыязджае ў Савічы з Мінска і бярэ на 80—100 кіларамаў памідораў, — кажа яшчэ адна жыхарка Савічаў, Таццяна Бігель. — Не на продаж, а проста для сябе і сваёй сям'і. Дзецям, унукам, на закаткі. Ён родам з гэтых мясцін, проста даўно жыве ў Мінску. Таму і ведае «брэнд» — савіцкія памідоры.

Аб тэхналогіях і камерцыйнай тайне

Сёння ў Савічах зарэгістраваны 73 гаспадаркі і пражывае 123 чалавекі. З іх 54 жыхары — працаздольнага ўзросту, сямёра — дзеці і падлеткі, астатнія — пенсіянеры. Большасць жыхароў Савічаў працуюць у ААТ «Эксперыментальная база «Вольна». Вырошчваннем таматаў людзі займаюцца тут у асноўным пасля работы, у вольны час.

— Памідоры — гэта толькі дадатковы даход, — распавялі мне ў Савічах. — Цяпер на іх не заробіш.

Праўда, ёсць у вёсцы некалькі сем'яў, асноўны даход якіх, — асабістая падсобная гаспадарка. Гэта маладзь, у іх справа пастаўлена сур'ёзна: цяпліцы, галандскае насенне, розныя сарты памідораў. У сярэднім каля кожнага дома пад агароды адведзена 50—70 сотак, хоць некатораму сем'і апрацоўваюць і па тры гектары зямлі. Але кіламетры парнікоў, як у Альшанах, тут не ўбачыш. У Савічах памідоры прынята вырошчваць у адкрытым грунце: пакуль памідор не атрымае соечнага святла, ён не будзе мець насычанага смаку.

Цяпліцы і насенне галандскай і польскай селекцыі ў Савічах выкарыстоўваюць маладзейшыя гаспадары. Старэйшае пакаленне аддае перавагу традыцыйным тэхналогіям і ўласнаму насенню.

— Часам, кад памідорныя кусты не пашкоджваліся туманам, вакол іх робяць агароджу з плёнкі, але зверху такі «парнік» плёнкай не накрываецца, каб расліны атрымлівалі дастатковa соечнага святла, — тлумачыць сакрэты мясцовай тэхналогіі старшыня Вольнаўскага сельвыканкама Наталля Ібрагімава. — Таму памідоры ў Савічах такія смачныя — натуральныя, вырашчаныя з любоўю.

«Хімію» пры вырошчванні сельгаспрадукцыі тут амаль ніхто не выкарыстоўвае. Апрацоўваюць расліны рана, у перыяд цвіцення. І часцей за ўсё гэта малочная сыроватка з дабаўленнем ёду. Угнаенні — толькі арганічныя: гной, кампост. Словам, ні адзін аматар здаровага ладу жыцця не пырчэпіцца: самы сапраўдны organic food. Тут не адбіраюць прадукцыю — для сваёй сям'і і на продаж. Вырошчваюць для пакупнікоў, як для сябе. Адсюль і адмоўнае стаўленне да «хіміі». Дастаткова шчодрага сонца Брэстчыны і ўкладзенай у сакавітыя салодкія плады карпатлівай працы.

Традыцыйна ў рамках фестывалю адбудзецца паказ гульнявых і дакументальных паўнаметражных (і ўпершыню кароткаметражных) кінастужак са Швецыі, Даніі, Фінляндыі, Ісландыі, Нарвегіі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. У асноўнай праграме «Паўночнага зззяння» каля 20 фільмаў закранаюць тэмы, што сугучныя слогану кінафоруму «Слухаць і чуць» (а гэта надзвычай актуальна ў святле сённяшніх падзей). Сёлета была створана новая візуальная канцэпцыя, праз якую фестываль запрашае даследаваць тэмы эмпатыі, пераемнасці пакаленняў, разбурэння старых узораў паводзін. Таксама ўпершыню ў межах фестывалю пройдзе пашыраная праграма маладога беларускага кіно.

Як адзначаюць арганізатары «Паўночнага зззяння», іх мэта «несці мастацтва кіно, магію паўночнай культуры пераважна ў перакладзе на беларускую мову не толькі ў сталіцу, але і ў рэгіёны Беларусі». Паказы фестывалю ладзіліся ў папярэднія гады ў Гомелі, Магілёве і Гродне.

Ёсць верагоднасць, што новы фармат аб'яднае аматараў кіно ў розных пунктах нашай краіны.

Алена ДРАПКО.

«Музей» Уладзіміра Высоцкага ў Беларусі

Яго адкрылі ў вёсцы Вялешына Капыльскага раёна. Арганізавала ўсё траюрадная цёткa паэта і акцёра, творчасць якога мае прыхільнікаў у розных пакаленнях і краінах.

Як кажа Надзея Высоцкая (яна працуе мастацтвазнаўцам і з'яўляецца прафесарам універсітэта) — гэта не музей, а проста гасціны дом 1917 года, дзе ёй удалося арганізаваць тры экспазіцыі, адна з якіх якраз прысвечана жыццю і творчасці Уладзіміра Высоцкага. Сюды можна будзе патрапіць бясплатна, але па папярэдняй дамоўленасці з гаспадыняй.

— У гэтай хаце я сабрала экспанаты ў некалькіх экспазіцыях. У сенцах можна азнаёміцца з народным мастацтвам нашай мясцовасці. У наступным пакоі знайшоў адлюстраванне перыяд 1917-га — 1920-х гадоў у кантэксце беларуска-амерыканскіх узаемаадносін (бо мясцовыя хэхары тады ездзілі ў Амерыку) — там змешчаныя фотаздымкі таго часу, зробленыя ў Нью-Ёрку, а таксама побытавыя рэчы. А потым зала, якая называецца «Высоцкі і яго эпоха», дзе сабраны артэфакты, звязаныя з Уладзімірам Сямёнавічам, — пласцінкі, плёнкі, больш за 20 альбомаў фатаграфій, забытыя вершы, вялікая шафа кніг самвыдату розных гадоў, — расказвае Надзея Высоцкая. — Таксама я збірала прыгожыя афішы, звязаныя з ім. І многія іншыя рэчы, якімі карыстаўся Высоцкі. У асноўным усё дарылі людзі, аматары яго творчасці, а нешта я купляла ў Германіі, Францыі, Італіі, Расіі. Бо імкнулася зрабіць гэтую экспазіцыю прыгожай, каб яна перадавала атмасферу эпохі... Няпроста Уладзіміру тады жылося, але народжаныя ім творы сталі класікай.

Надзея Фёдараўна кажа, што яны з Высоцкім вельмі падобныя знешне, што яе нават здзіўляе. А самога паэта яна характарызуе як «інтэлігентнага чалавека з асаблівай энергетыкай». Ён мог збіраць каля сябе людзей, але разам з тым быў непрадказальнай і складанай асобай. З ім заўсёды было цікава знаходзіцца ў адной кампаніі. Магчыма, гэтым і прыцягваў увагу да сябе і да ўсяго, што ствараў. І цяпер у прыхільнікаў Уладзіміра Высоцкага будзе яшчэ адно месца, дзе яны змогуць успомніць яго і адчуць атмасферу яго жыцця і творчасці.

Алена ДРАПКО.

Беларускі пантэон

Дарогі пана Бутрымовіча

Герб «Сякера».

БЕЛЫЯ плямы беларускай гісторыі... Часам здаецца, што, азіраючыся на сваё мінулае, мы бачым заснежанае поле з асобнымі нешматлікімі пралінамі. Гістарычнае бяспамятства — самая страшная хвароба, якая можа спасцігнуць народ. Давайце ж угледзімся ў тое, што замялі снягі часу, што нібыта і відочнае — але ўсё яшчэ не асэнсаванае, у яркіх персанажаў, якія апынуліся ў цені эпохі...

* * *

Нашы продкі казалі, калі праводзілі кагось у шлях: «Рушнiком дарога!»

Але дарогі беларускія рэдка калі клаліся рушнiком. Як сведчыў у XVII стагоддзі сакратар пасольства Свяшчэннай Рымскай імперыі Ёган Корб, праязджаючы ад Ашмян да Ракава, «нязмерныя лясы, нераз'езджаныя дарогі, заслоненыя дрэвамі з навісламі галінамі, затрымлівалі нас».

Але ў той час, у які мы цяпер адправімся, на Беларусі з'явілася першая спраектаваная дарога — так званы Гасцінец Бутрымовіча, зроблены за кошт падстарасты пінскага Мацея Бутрымовіча. Зрэшты, і першая вясланая дарога на Беларусі — канал — таксама ўзнікла не без удзелу гэтага ж персанажа.

Нашчадак Бутрыма

Нарадзіўся наш герой 275 гадоў таму, у сям'і Юзафа Бутрымовіча, каморніка Аршанскага павета. Род меў герб «Сякера». Баявы герб, і заснавальнік роду бавіўся — рыцар Бутрым, які праславіўся падчас Грунвальдскай бітвы. А яшчэ запомніўся сучэснікам змрочным і ўпартым характарам.

Праўда, калі мы глядзім на партрэт Мацея Бутрымовіча, бачым выкшталцонага свецкага пана, з прыгожым уладным тварам. Мяркуючы па партрэце, быў пан Мацей дужа абаяльным. Прынамсі, для таго каб займець уплывовага сябра, самога Міхала Казіміра Агінскага, вялікага гетмана, што спаборнічаў за сэрца расійскай царыцы Кацярыны з Панятоўскім, браў удзел у шляхецкім рокашы супраць расійскіх войскаў і караля, але ганебна прайграў бойку пад Сталовічамі, замірыўся з уладамі і вярнуўся ў свой Слоним, каб стварыць «сядзібу музаў».

Кажуць, выхаванец пінскіх езуітаў Мацей Бутрымовіч пасябраваў з Агінскім яшчэ ў юнацтве, калі адбываў вайсковую службу ў славутым Пяцігорскім войску Вялікага Княства Літоўскага — войска так называлася, бо ў XVI стагоддзі там служылі каўказскія горцы. Мацей даслужыўся да капітана, але вялікіх ваенных подзвігаў не здзейсніў. Галоўнае, што прывабіла амаль ровесніка Агінскага і рэформаў Агінскага ў Бутрымовічу, — здольнасць да прадпрымальніцтва, любоў да ідэй модных тады фізіякратаў.

Цераз грэблю

Дзякуючы шлюбу з Хрысцінай Ляхшырмай Бутрымовіч займеў багатыя ўладанні на Піншчыне. Вось дзе можна разбудавацца... Заснаваў маёнтак, названы ў гонар жонкі Крысціна. Але палескія дарогі — вось ужо не рушнікамі кладуцца, балоты адныя. Таму давялося пачынаць з пабудовы прыстойных гасцінцаў. «Практычна ўсё, што застаецца звыш жыццёвых патрэб, закопваю ў зямлю ці кладу ў будову», — пафасна скардзіўся Бутрымовіч. Але ж не забудзем, што меў пан добрага спонсара, князя Агінскага. Зацікаўленасць магната ў дыхтоўных шляхах з'явілася яшчэ ў юнацтве: у 1748 годзе карэта маладога элегантнага Міхала Казіміра Агінскага на адной з палескіх вясковых дарог зваліласе ў яму. Багаж патануў, радавіты пасажыр добра выкачаўся ў гразі...

Бутрымовіч з дапамогай Агінскага пабудаваў два дыхтоўныя гасцінцы — з Пінска на Вальянь і з Пінска да Слоніма. Мясцовая шляхта напачатку пацяшалася — як гэта па непразалых багнах! Але ўпартым характарам Мацей удаўся ў продка. Узводзіліся дамбы і масты, асушаліся балоты, клаліся цераз дрыгву гаці... Даследчык Армен Сардараў, які шукаў сляды гасцінца Бутрымовіча, так вызначае напрамак легендарнай «першай дарогі»: Пінск — Горнава — Сярнічкі — Хлябы — Лапаціна — Ласіцк — Жалкіна. І заўважае, наколькі складаная была канструкцыя: два слаі бярвенняў — лагі і накат, далей «дарожная адзежа» — галлё і грунт, торф. Ды яшчэ абапал — канавы для асушэння. Каля гасцінцаў часта садзілі вербы, чыё галлё выкарыстоўвалася ў будаўніцтве.

Пінскі мур.

Амаль Венецыя

Звязана імя Бутрымовіча і з воднымі дарогамі — знакамітым Агінскім каналам і цяперашнім Дняпроўска-Бугскім. Калі іх будаўніцтва завяршылася, пан Мацей зладзіў урачыстую «прэзентацыю». Дзесяць чоўнаў-абінікаў, на кожным «трое плытагонаў, сапраўдных пінчукоў, апранутых так, як хадзілі пінчукі сто з лішкам гадоў», на чале з суддзёю пінскім Бутрымовічам адправіліся па Піне, далей па Бугу і Вісле ў Варшаву і Гданьск. Палеская флатылія везла дарункі: «мёд свежы, воск, лой, грыбы, рыбу вяленую, ўюной сушаных, крупы ячменныя ды іншыя тутэйшага краю прадукты». Як піша Адам Мальдзіс, «уся Варшава збеглася глядзець на «палескі караван». У тым ліку кароль, па чыім загадзе ў гонар падзеі выбілі медаль. А галоўнае — Панятоўскі выказаў жаданне наведаць маёнткі рэфарматара, пакольскі ўсё адно збіраўся ў Гародню на сойм.

Манарх уразіўся: у Крысцінаве, палескай глушы, аказаліся цудоўны палац і гаспадарка, меліся каналы са шлюзамі, па якіх проста да сядзібы маглі падплываць караблі. Панятоўскага якраз на караблі да Крысцінава і прывезлі. Ілюмінацыя, стрэлы з гармат, сады на былых балотах... Уражаны кароль папаляваў на Крысцінаўскіх ставах на качак і літасціва падтрымаў планы гаспадара наконт пракладкі новых дарог.

На скрыжаванні культур

Нават разглядаючы партрэт, можна сцвердзіць, што Мацей здольны палітыкан. Сярод ідэй, якія ён падтрымліваў, была спроба надаць так званым дысідэнтам Рэчы Паспалітай — людзям іншага веравызнання — роўныя правы з каталікамі. У рамане Элізы Ажэшкі «Меір Эзафовіч» яўрэйскі шукальнік праўды Герш выпраўляецца па дапамогу. «Куды паехаў Герш? За горы, за лясы, за рэкі... У далёкую старану, дзе сярод балотных раўнін і чорных пінскіх лясоў жыў красамоўны абаронца раўнапраўя і асветніцтва польскіх яўрэяў, дэпутат сойма, Бутрымовіч, спрадвечны шляхціц. Ён быў мысляр. Ён бачыў ясна і далёка; не схаваныя былі ад яго схаваныя ад іншых сувязь гістарычных падзей, падставы і наступствы іх». У рамане Бутрымовіч ветла прымае Герша, яны разам змагаюцца за прыняцце новага закона. Але прайграюць — бо знікае сама дзяржава. «Разваліўся вялікі будынак... і бэльскі знішчылі ўсе нашы вялікія надзеі і працу», — з горыччу гаворыць Герш.

Дарагой ценой

Вы ўжо ўявілі Бутрымовіча як гэткага бездакорнага прагрэсіста? Ну так, заснаваў школу для дзяцей рамеснікаў... Абараняў правы дысідэнтаў...

Але яшчцё не малюе адной фарбай.

Калі мы кажам, маўляў, падстароста пінскі будаваў дарогі — гэта ж не значыць, што ён ўласнаручна махаў рыдлёўкаю. А вось тыя, хто гэта рабіў, не мелі не толькі славы, але часта і грошай. Каб сагнаць «рабочую сілу» на пабудову дарог ды каналаў, і ўладальнік пінскае эканоміі Міхал Казімір Агінскі, і ягоны намеснік Мацей Бутрымовіч не саромеліся змушаць па паншчыны і душыць падаткамі. Баронячыся ад бясчынняў, у 1784 годзе, калі кароль наведаў Крысцінава, жыхары мястэчка Гарадная, што на Піншчыне, спрадвечу ведомага як цэнтр ганчарства, выпрасілі ў яго «Аберагальны ліст». А за гэта ў наступным годзе Бутрымовіч наслаў на Гарадную 50 стральцоў, якімі кіраваў лоўчы Сандэцкі. Мяшчане адбіліся, але ў 1788 годзе напад паўтарыўся. Гарадзенцы падалі на Агінскага і Бутрымовіча ў суд, захаваўся дакумент, у якім вяны апісваюць беззаконні Бутрымовіча: «Напрыклад, разбіўшы гаршкоў першым разам 10 100, а другім 2100 штук, болей абпальваць гаршкоў не дазволіў, наслаўшы стральцоў, горны вадою паазлівае, не дапускаючы займацца гэтым рамяством, якім адзінным забяспечвалі сабе дзённае харчаванне».

Суд цягнуўся ажно да знішчэння Рэчы Паспалітае, а тады скарга страціла сэнс.

На сарака палях

Яшчэ адзін напамінак аб нашым герою — мураваны палац у Пінску, які так выслугаўся сярод драўлянае забудовы, што месцічы празвалі яго проста — «Мур». Пінскі суддзя спяшаўся завяршыць будаўніцтва да прыезду караля, і першапачаткова, як сведчаць гісторыкі, палац мусіў належаць брату Панятоўскага, Міхалу. Не дарэмна сам кароль паклаў першы камень у падмурак. Але ўрэшце Мур дастаўся дачцэ Бутрымовіча Юзэфе.

Цікава, што збудаваны дом на крыніцах, плыткай зямлі каля старога абарончага вала. Таму вілеенскамі архітэктар Шыльдхаўзэ і інжынерам давялося пазавіхацца. Каб будыніна стаяла, у вільготнаму глебу загналі сорак дубовых паляў. Затое падчас паводкі палац урачыста ўзвышаўся над водой, не раўнуючы, як у Венецыі. Пісьменнік Юзаф Крашэўскі казаў, што будынак занадта прыгожы — быццам «фацэт у вёсцы, які саромеца сваёй прэтэнцыёзнай архітэктуры сярод іншых хацінак, што стаяць без цырымоній, падобна скрынкам на палiцах».

Сёння ў Муры — мясцовы загс і музей Бутрымовіча Палесся. У музеі захоўваецца пліта, калісьці ўсталяваная ў гонар закладкі Крысцінава, на адваротным баку якой надпіс у памяць памерлых слуг Мацея Бутрымовіча — кухара Лявона Ажаховіча і наглядчыка стайняў Яна Кучэўскага.

Менавіта ад ганка палаца і пачынаўся «гасцінец Бутрымовіча», першая беларуская спраектаваная дарога.

Дзед мастака

Дачка пана Мацея, Юзэфа, была выдатнай пяяністкай і выйшла замуж за інжынера-фартыфікатара Міхала Орду, што выглядае невыпадковым. Безумоўна, Мацей Бутрымовіч сябраваў з аднадумцамі. Юзэфа рана засталася ўдавой, сама выгадавала пяцярых дзяцей... Адзін з іх — славуты мастак Напалеон Орда, аўтар цэлай галерэі малюнкаў беларускіх архітэктурных помнікаў. Меліся яго карціны і ў пінскім Муры. Толькі вось падчас пажару 1901 года мала што ад зборнай мастацтва там засталося.

Год смерці Мацея Бутрымовіча невядомы. Але памяць пра падстарасту, які зрабіў Пінск портам, адкуль плавалі караблі ў Балтыйскае і Чорнае моры, захоўваецца дасюль, яго імя носіць вуліца ў Пінску.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.



Мацей Бутрымовіч.

У пошты — лічбавая будучыня

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі параўноўваць з тым фарматам, у якім працавала «Белпошта» 25 гадоў таму, то змянілася амаль усё, — адзначае Святлана Юркевіч. — Алошнім часам мы пачалі імкліва развіваць праекты, якія грунтуюцца на высокіх тэхналогіях. Дзе магчыма — ідзе лічбавізацыя і аўтаматызацыя. Напрыклад, зараз «Белпошта» завяршае стварэнне Нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы. Гэта значыць, што заказныя лісты будуць перадавацца не на папяровым носьбіце, а электронным шляхам. Заказныя лісты і карэспандэнцыя ад ведамстваў таксама будуць «прылятаць» у электронным фармаце ў асабісты кабінет карыстальніка. Адказчыку гэта дасць перавагу — не трэба будзе распісвацца ў бланку за атрыманне такога паслання.

— Пры гэтым пошта шукае шлях, як жа зарабіць, — працягвае суразмоўца. — І ў гэтым моцна дапамагае велізарная колькасць міжнародных паштовых адпраўленняў. Пасылак з азіяцкіх краін год ад году становіцца ўсё болей. Са свайго боку, мы зацікаўлены ў тым, каб не было ніякіх затрымак у дастаўцы замоўленых рэчаў. Не будзем хаваць — пасылкі зараз апрацоўваюцца ўручную, а вось для лістоў было закуплена спецыяльнае сартавальнае абсталяванне. Аналагічная лінія неўзабаве з'явіцца і для пасылак, каб не адставаць ад іншых краін. Напрыклад, у той жа Расіі працуюць тры сартавальныя цэнтры.

Таксама ў планах «Белпошты» — развіццё інтэрнэт-гандлю. Мяркуецца, што на базе арганізацыі будзе створана спецыяльная платформа, дзе пастаўшчыкі і вытворцы прадукцыі будуць размяшчаць свой тавар і прадаваць яго. Такі маркетплэйс можа з'явіцца ўжо ў наступным годзе.

— Сусветны паштовы саюз штогод ацэньвае якасць працы паштовых сістэм у тых краінах, якія ўваходзяць у яго склад. Па выніках 2019-га мы падняліся з 37-га месца на 21-е. Сярод крытэрыяў ацэнкі — хуткасць праходжання паштовых адпраўленняў, якасць аказання паслуг і іх даступнасць. Гэта значыць, па міжнародных стандартах мы падняліся да ўзроўню развітых краін свету.

— Зараз сетка «Белпошты» налічвае па ўсёй краіне крыху больш за тры тысячы аддзяленняў, у якіх працуе звыш 20 тысяч супрацоўнікаў. Як жа будзе трансфармавацца структура ў далейшым?

— Казаць пра тое, што мы скіраваныя на масавае адкрыццё новых аддзяленняў, не зусім правільна. Канешне, там, дзе яны неабходныя, яны будуць з'яўляцца. Але перад гэтым будзе вывучацца попыт на паслугу, бо трэба ж утрымліваць інфраструктуру, рэгулярна аплачваць камунальныя паслугі і арэнду памяшкання. Таму мы будзем развіваць перш за ўсё паштаматы — спецыяльныя аўтаматызаваныя прылады для працы з паштовымі адпраўленнямі. І яны будуць запатрабаваны. Напрыклад, у тым жа Мінску ёсць новыя мікрараёны пераважна з маладым насельніцтвам, якое выдатна сябруе з гаджэтамі. І асноўная паслуга ў гэтых мясцінах — прыём і выдача пасылак. У наступным годзе мы плануем закупіць дваццаць паштаматаў, далей іх таксама будзе станавіцца болей.

— Але і сістэма падрыхтоўкі кадраў таксама змяняецца.

— Больш за тысячу нашых аддзяленняў аказваюць яшчэ і банкаўскія паслугі. З банкамі на гэты конт заключаецца адмысловая дамова. Асабліва гэта важна для сельскай мясцовасці, адкуль банкі пакрысе сыходзяць. Таму супрацоўнікі, якія шчыруюць у аддзяленнях паштовай сувязі, дасягнулі ўзроўню не проста аператара, а спецыяліста. Мы, у сваю чаргу, арыентуемся на тое, каб даць спецыяльную адукацыю тым супрацоўнікам, хто яе на розных прычынах не мае.

— Як на работу пошты паўплывала сітуацыя з каранавірусам?

— Самы складаны час быў увесну, калі краіны пачалі актыўна закрываць межы. Для таго каб дастаўляць адпраўленні, даводзілася шукаць іншыя варыянты. І дзесьці з-за гэтага пасылкі, на жаль, ішлі да адрасата даўжэй. Але з нашага боку мы рабілі ўсё, каб затрымкі былі мінімальныя. Калі ж казаць пра арганізацыйны складнік, то не сакрэт, што і нашы супрацоўнікі хварэлі або сыходзілі на самаізаляцыю. Але за ўвесь гэты час не было закрыта ніводнае аддзяленне. Дзесьці даводзілася пераразмяркоўваць працуючых, але паслугі не перасталі аказваць ні на хвіліну.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

У ГОНАР АФАНАСІЯ БРЭСЦКАГА

У Брэсце адбылося гашэнне паштовага блока з маркай у гонар Афанасія Брэсцкага. Перадгісторыя гэтай падзеі такая. Для свайго першага наведвання Брэста Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін абраў 18 верасня — дзень памяці прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага. З нагоды свята новы кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы адслужыў Божаственную літургію ў Свята-Афанасьеўскім мужчынскім манастыры.

Па заканчэнні богаслужэння адбылося гашэнне паштовага блока з маркай «Выдатныя асобы Беларусі. Афанасій Брэсцкі», які выпушчаны ў абарачэнне Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь у гонар светлай памяці аб прападобнамучаніку. У аснове маркі — партрэт святога, падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Брэсцкай епархіяй. Яе наклад складае 12 тысяч паасобнікаў.

Дарэчы, у калекцыі філатэлістычнай прадукцыі «Белпошты» налічваецца ўжо больш як 20 беларускіх паштовых марак на праваслаўную тэматыку. На першай з іх быў выяўлены Крыж Ефрасінні Полацкай.

Дырэктар Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Валянціна ПУХ адзначыла, што сённяшняя падзея — гэта выдатная навіна для тысячагадовага Брэста.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ДВАЙНАЯ НАГОДА

Сёння ў Смалявічах расчыніць дзверы новае паштовае аддзяленне. Размесціцца яно на вуліцы Цэнтральнай, 20Б. Урачыстасць прымеркаваная не толькі да 25-годдзя РУП «Белпошта», але і да Дня горада Смалявічы. Падрабязней пра тое, якую карысць для жыхароў горада-спадарожніка Мінска прынясе новае аддзяленне, «Звязда» распавяла дырэктар Мінскага філіяла Жанна ШАБЕКА.

— Яно размесціцца ў новым доме на плошчы ў сто квадратных метраў. Па дзеючых нарматывах, адно аддзяленне мусіць абслугоўваць не менш за восем тысяч чалавек. Справа ў тым, што Смалявіцкі ўчастак паштовай сувязі дагэтуль налічваў усяго адно гарадское аддзяленне і сямнаццаць сельскіх. Насельніцтва жорада за апошні час істотна вырасла і перайшло аднаку ў 16 тысяч чалавек. Актыўна будуюцца і новыя шматпавярховыя дамы. Таму мы таксама мусім пашырацца сваю прысутнасць, каб аказваць паслугі больш якасна і камфортна. Спадзяёмся, што два аддзяленні акны дапамогуць жыхарам Смалявіч пазбавіцца ад чэргаў.

Новае структурнае падраздзяленне будзе працаваць па ўсіх дняхтыдня, акрамя нядзелі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЯКАСНА, ХУТКА, ДАСТУПНА

«На Віцебшчыне каля 450 аб'ектаў паштовай сувязі. Нашы клиенты — гэта галоўнае для нас. Прадастаўленне якасных, сучасных, тэхналагічных паслуг — асноўны складнік нашай дзейнасці», — падкрэсліў дырэктар Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Сяргей МАКСАК.

Каб забяспечыць людзям аднолькавы доступ да комплекснага абслугоўвання, удасканальваюцца яго формы. Існуе матарызаваны спосаб дастаўкі, пры якім увесь пералік паслуг у поўным аб'ёме прадастаўляе кіроўца-паштальён, які абслугоўвае паштовы маршрут. Дарэчы, цікавая статыстыка: пошту і друкаваныя СМІ перавозяць па вобласці па 185 маршрутах каля 280 аўтамабіляў...

У Аршанскім раёне мінулай восенню ўкаранёны пілотны праект «Мабільны паштальён». І пры дапамозе аднайменнага апаратна-праграмнага комплексу аказваецца шырокі пералік паслуг, які пастаянна пашыраецца. «Адна з асноўных нашых перспектыў — развіццё бізнес-кірункаў, прыцягненне новых клиентаў і захаванне клиенцкай базы ў сегменце рынку электроннай камерцыі «E-commerce», — працягвае Сяргей Максак.

Філіялам арганізавана эфектыўнае супрацоўніцтва з інтэрнэт-сегментам рынку краіны. Больш за 560 віртуальных крамаў вобласці карыстаюцца паслугамі па перасылцы тавараў. У гэтым кірунку ёсць намер утрымаць занятыя пазіцыі.

«Забеспячэнне філіяла кваліфікаванымі работнікамі, эфектыўны падбор, расстаноўка і рэалізацыя працоўнага патэнцыялу кадраў у адпаведнасці з іх прафесійнымі, дзелавымі і асабістымі якасцямі застаецца прыярытэтнай задачай павышэння якасці аказання паслуг і нашага развіцця», — адзначыў Сяргей Максак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАЦЯГЛАСЦЬ МАРШРУТАЎ — 22 ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ

Сёння Гомельскі філіял РУП «Белпошта» — гэта калектыў з больш як 3600 супрацоўнікаў. Сетка паштовай сувязі складаецца з 555 аб'ектаў. Сярод іх 489 аддзяленняў паштовай сувязі (137 гарадскіх і 352 сельскіх АПС). У складзе філіяла таксама звыш паўсотні перасоўных аддзяленняў сувязі, сем паштовых пунктаў і сем бізнеспошт.

— Наша дзейнасць накіраваная ў першую чаргу на павышэнне клиентаарыентаванасці, — адзначае **дырэктар Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна ЦЯРЭШЧАНКА.** — Прыярытэтная задача філіяла — развіццё сістэм самаабслугоўвання клиентаў. Гэта і выкарыстанне плацежна-даведачных тэрміналаў, паштаматаў, абсталявання «Электронная чарга», IT-тэхналогій у выточным працэсе. Актыўна ўкараняем сучасныя метады абслугоўвання карпаратыўных клиентаў у структурных падраздзяленнях «Бізнес-пошта» без фізічнай прысутнасці нашага клиента.

Сярод асабліва важных напрамкаў развіцця — пашырэнне фінансавых паслуг: работы сэрвісу пасюрнай пошты EMS Belpost, прыёму і дастаўкі паштовых адпраўленняў у офіс ці дадому ў межах паслугі «Паштовы кур'ер».

— Запатрабаваная таксама перавозка тавараў альбо грузаў ад прадстаўнікоў электронай камерцыі ў рамках пакета «E-commerce» і «MAX». Актыўна развіваюцца такія паслугі, як «Аплачаная перасылка» і «Аплата за перасылку паштовага адпраўлення пры ўручэнні», — дадае дырэктар Гомельскага філіяла РУП «Белпошта».

На абслугоўванні па перавозцы пошты задзейнічана 145 паштовых маршрутаў: два міжабласныя, 29 міжраённых, 71 унутрырайонны, 43 гарадскія. Працягласць маршрутаў складае каля 22 тысяч кіламетраў. Дастаўка друкаваных СМІ і паштовых адпраўленняў ажыццяўляецца па 1240 даставачных участках.

— У першую чаргу, каб у поўным аб'ёме задаволіць попыт юрыдычных асоб і насельніцтва на прадастаўленне нашых паслуг, мы забяспечваем бесперабойную работу аб'ектаў паштовай сувязі, — падкрэслівае Галіна Цярэшчанка. — Сярод асноўных задач дзейнасці філіяла, безумоўна, варта адзначыць і забеспячэнне высокай якасці і эфектыўнасці паштовага сэрвісу.

На тэрыторыі Гомельскай вобласці звыш дваццаці аддзяленняў паштовай сувязі аснашчаны сістэмай кіравання патокамі клиентаў «Электронная чарга». У 53 аддзяленнях устаноўлены сістэмы тэхналагічнага відэанаазірання і аўдыёзапісу. Больш як 140 АПС выкарыстоўваюць у сваёй рабоце аплатна-даведачныя тэрміналы, а таксама 64 аддзяленні маюць асобнае апераційнае акно па прадастаўленні паштовых паслуг у прыярытэтным парадку.

Сэрвіс

«А АДНОЙЧЫ НАШУ АПЕРАТАРКУ ЗАПРАСІЛІ ЗАМУЖ ПА ТЭЛЕФОНЕ»

Чым жыве кантакт-цэнтр «Белпошты»?

Тры кароткія лічбы — 154. Гэта нумар кантакт-цэнтра «Белпошты». Яго набіраюць тыя, хто сутыкаецца з пытаннямі датычна паслуг, якія аказваюць паштавікі. За кожным з такіх званкоў стаіць свая гісторыя. «Звязда» вырашыла пабываць, як гаворыцца, «на другім канцы праводу». Кантакт-цэнтр «Белпошты» месціцца ў самым цэнтры Мінска. Гэта зусім невялікае памяшканне, дзе адначасова працуе некалькі аператараў.



Фота Яны ХВЕДЧЫНА.

— Калісьці ўсё пачыналася з таго, што быў створаны даведачна-інфармацыйны сектар прадпрыемства, — расказвае **начальнік кантакт-цэнтра Людміла КОНЮХАВА *(на фота)*.** — Ён пачаў працаваць 1 ліпеня 2003 года. Карыстальнікі нашых паслуг хацелі атрымліваць максімальна хутка інфармацыю аб паслугах паштовай сувязі. Таму патрабавалася як мага больш якасна і аператыўна пра гэта расказваць. Раней гэта адбывалася ў аддзяленнях сувязі «на месцах» паралельна са звычайнай работай. Але ўсё-такі было вырашана стварыць асобны цэнтр, які б займаўся толькі гэтымі пытаннямі. І час паказаў, што такі крок быў правільны.

Кантакт-цэнтр працуе з 9 да 20 гадзін, па выхадных і святочных днях — да 17.

— Як звалюцыяніраваў кантакт-цэнтр за 17 гадоў?

— Спачатку нам выдзелілі кароткі нумар 054. Ён да таго належаў «Белтэлекаму». Гэта была даведка па расліках за міжгародняю сувязь. У першы год работы ў даведачна-інфармацыйны сектар вельмі часта звалілі менавіта на гэтым пытанні. З цягам часу з'явілася спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, якое дазваляе апрацоўваць вялікую колькасць уваходных і выходных званкоў, размяркоўваючы іх паміж свабоднымі аператарамі. Чарга чакання пры гэтым нядоўгая. Калі нагрузка вялікая і карыстальнік не можа падключыцца да аператара на працягу хвіліны, то яму прапаноўваецца замовіць зваротны званок нашага спецыяліста. Дастаткова толькі націснуць кнопку. Клиент становіцца ў чаргу. І як толькі ва ўваходных званках з'яўляецца паўза, сама праграма дазвоньваецца да клиента. Штодня бывае некалькі такіх тэлефанаванняў.

— Як моцна загружаны аператары?

— У дзень паступае сумарна прыкладна пяцітысячы выклікаў. Гэта не толькі тэлефанаванні, але і паведамленні ў сацыяльных сетках (цяпер мы прадстаўлены ў Facebook і «УКантакце»), і чаты на афіцыйным сайце. Прычым з цягам часу анлайнавыя формы звароту пакрысе набіраюць папулярнасць, і зараз іх доля складае каля 5 %. Але званкі пакуль займаюць пераважную долю. У планах — прыход і ў Telegram.

— Калі ў кантакт-цэнтры назіраецца пікавы час?

— Чамусьці самы «касавы» дзень у нас — чацвер, — заўважае **начальнік упраўлення менеджменту якасці Наталля КОЗЫРАВА.** — А вось самы папулярны час вызначыць складана. Часцей за ўсё гэта з 13 да 14, калі ў арганізацыях наступае час абеду. Пэўна, у нашых клиентаў з'яўляецца магчымасць знайсці адказы на пытанні, якія іх хвалююць.

Сярод тых, якія ўздымаюцца часцей за ўсё, — гэта прыём міжнародных і ўнутраных паштовых адпраўленняў, работа паскоранай пошты EMS, кантактныя даныя аддзяленняў сувязі. Шмат пытанняў па адсочванні адпраўленняў — гэта не дзіўна, бо інтэрнэт-гандаль трывала ўвайшоў у наш побыт.

Наша філасофія — работа ў фармаце вырашэння пытання «тут і цяпер». Клиент мусіць сысці ад нас, атрымаўшы максімальна поўную інфармацыю. Таму пытанні дзеляцца на тыя, якія можам вырашыць тут і цяпер, і звароты, якія патрабуюць кансультацыі вузкапрофільнага спецыяліста. Таксама наш кантакт-цэнтр працуе ў рэжыме «гарачай лініі» прадпрыемства на ўсю краіну.

Акрамя таго, мы высвятляем, наколькі клиенту спадабалася паслуга, што б ён захацеў убачыць новага ці як удасканаліць наяўны сэрвіс. Таму за дзень мы абзвоньваем 150—200 клиентаў з просьбай ацаніць нашу працу і ўнесці пажаданні і прапановы.

— Якія навыкі мусіць мець аператар кантакт-цэнтра?

— Гэта павінен быць дасведчаны спецыяліст з адукацыяй у галіне паштовай сувязі з абавязковым практычным досведам работы ў адным з аддзяленняў. Паколькі ён будзе кансультаваць іншых людзей — ён мусіць на практыцы ведаць усе нюансы работы. Толькі тады паслуга будзе аказана максімальна якасна. І, канешне ж, мець правільнае і дакладнае вымаўленне.

— Уявім сітуацыю — да вас патэлефанавалі з іншай краіны...

— Нашы аператары размаўляюць на беларускай і рускай мовах. Але і на выпадак званка з замежжа ў нас ёсць выйсце. Магчымасці нашага праграмнага забеспячэння дазваляюць задзейнічаць перакладчыка. За кантакт-цэнтрам замацаваны спецыяліст, які працуе ў міжнародным аддзеле. Ён у любы момант гатовы падключыцца да канферэнц-сувязі. У чатах нам прасцей — дапамагаюць анлайн-перакладчыкі.

— Якая ж геаграфія запытаў?

— З замежжа да нас часцей за ўсё звяртаюцца з ЗША і Кітая, Аўстраліі і Вялікабрытаніі. Гэта звязана з міжнароднымі паштовымі адпраўленнямі. Хоць было адночы, што ў чат «пастукаліся» нават з аднаго з астравоў Французскай Палінезіі.

— Ці бываюць нечаканыя тэлефанаванні?

— Як правіла, у нас працуюць маладыя дзяўчыны з прыемнымі галасамі. Некаторыя хочуць пазнаёміцца, даведацца асабісты тэлефон, запрасіць на сустрэчу. І быў нават адзін выпадак, што нашу аператаркру анлайн запрасілі замуж.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Звярнуцца ў кантакт-цэнтр «Белпошты» можна не толькі па нумары 154, але і па мабільнай сувязі. Звяртаніце ўвагу — гэтыя нумары таксама заканчваюцца на 154:
МТС +37533 3000154;
А1 +37544 5900154.

СФЕРА ПАШТОВЫХ ПАСЛУГ ПАШЫРАЕЦЦА

Сёлета ў Гродне адкрыта другое аддзяленне паштовай сувязі ў мікрараёне Альшанка, на чарзе — такі ж аб'ект у жылой забудове Грандзічы.

Як паведаміў **дырэктар Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Андрэй АНІСІМАЎ**, гэта 22-е аддзяленне абласнога цэнтра, дзе аказваецца поўны комплекс паслуг. Новы аб'ект разлічаны на абслугоўванне 12 тысяч чалавек. Да канца года ў Гродне плануецца адкрыць паштовае аддзяленне ў мікрараёне Грандзічы, дзе зараз вядзецца актыўная забудова. З узвядзеннем гарадскіх мікрараёнаў туды таксама будуць прыходзіць і новыя аддзяленні паштовай сувязі.

Сфера абслугоўвання насельніцтва рэгіёна пастаянна пашыраецца. Не так даўно адкрыты стацыянарныя аддзяленні паштовай сувязі ў мікраранах Альшанка і Вішнявец. Такі ж аб'ект з'явіўся і ў гарадзе атамшчыкаў Астраўцы.

Гродзенскі філіял «Белпошты» вядзе актыўную мадэрнізацыю наяўных аб'ектаў, падкрэслівае Андрэй Анісімаў. За апошнія гады новы выгляд набыў Дом сувязі ў Гродне. Значнае аднаўленне закранула ўчасткі паштовай сувязі ў раённых цэнтрах, а таксама аграгарадках. Гэта работа вялася ячмсь і ў рамках дзяржаўнай праграмы аднаўлення і развіцця сельскіх населеных пунктаў. Падчас рэалізацыі праграмы было адноўлена амаль 240 аб'ектаў паштовай сувязі.

Вядома, у гродзенскім філіяле галоўным фактарам работы з'яўляецца ўкараненне новых відаў паслуг. Набылі папулярнасць паслугі міжнародняй і ўнутрырэспубліканскай паскоранай пошты, комплекс паслуг па перасылцы і дастаўцы паштовых адпраўленняў ад інтэрнэт-крамаў і гандлёвых кампаній, паслугі паштовага кур'ера і экспрэс-кур'ера.

Нядаўна пачаў дзейнічаць праграмна-тэхнічны комплекс адсочвання зарэгістраваных паштовых адпраўленняў. Яго ўкараненне дазваляе кантраляваць усе этапы апрацоўкі паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ сельскім жыхарам, дазваляе пашырыць рэалізацыю тавараў штодзённага попыту, гарантуе дастаўку шматгавых пасылак па заяўках адрасатаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Да свята — падарункі клиентам

— Да 25-годдзя стварэння РУП «Белпошта» наш Магілёўскі філіял прымеркаваў адкрыццё істотна абноўленага цэнтральнага аддзялення паштовай сувязі ў Бялынічах, — паведаміў **Аляксандр БРУЧЫКАЎ *(на фота)*, дырэктар Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта».** Аперацыйная зала для клиентаў стала ў паўтара раза шырэйшая, абсталяваны зручныя месцы чакання як для дарослых клиентаў, так і для іх дзяцей. Для малых створана арыгінальная гульнявая зона ў выглядзе вясёлай хаткі, якую можна размалёўваць рознакаляровымі крэйдамі. Вельмі ўпрыгожыла прастору дэкаратыўнае пано з гербам Бялыніч у выглядзе нядаўна выпушчанай маркі. Яно выканана ў тэхніцы інкрустацыі з маналітнага празрыстага полікарбанату і з'яўляецца эфектным фонам для сэлфі. Светлыя спакойныя фарбы ў інтэр'еры, зручная мэбля, абсталяваная ўсім неабходным рабочая зона для аператара, — усё гэта дазваляе стварыць настрой і паскорыць працэс абслугоўвання клиента. Для 10-тысячнага горада, дзе ўсяго адно паштовае аддзяленне, гэта вельмі важна.

Аддзяленне, як і раней, аказвае поўны спектр паштовых і няпрофільных паслуг, сярод якіх прыём і выдача лістоў, пасылак і грашовых пераводаў, афармленне падпіскі на любімыя друкаваныя выданні, выплата пенсій і дапамог, прыём плацяжоў, рэалізацыя разнастайнага асартыменту мастацкіх марак, паштовак, канвертаў і тавараў спажывецкага попыту. З новаўзведзенняў — спецыяльна абсталяванае рабочае месца па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў. Жыхарам горада больш не прыйдзецца марнаваць час у агульнай чарзе, усё можна будзе зрабіць значна хутчэй і прасцей.

Абноўленае паштовае аддзяленне для Бялыніч — гэта сапраўды вельмі пажаданы і доўгачаканы падарунак. Урачыстыя мерапрыемствы па адкрыцці адбыліся 17 верасня, якраз напярэдадні святкавання чэрэпцастагоддзя прадпрыемства «Белпошта». Бялыніча не пераналіся, што тут сапраўды ўтульна. Шырокі спектр тавараў і паслуг, кваліфікаванымі ветлівыя супрацоўнікі зробяць усё для таго, каб сюды хацелася заходзіць як мага часцей.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «АСБ-Агро Кухтичи» (Продавец)

Лот № 1: здание клуба,

623/С-59614, 214,9 кв. м, Минская обл., Узденский р-н, Неманский с/с, д. Ракошичи, ул. Садовая, 1.

Начальная цена с НДС – 19 680,00 руб.
Задаток – 5 900,00 руб.
Земельный участок 625682108701000175, 0,1516 га. Право аренды по 09.09.2074.
Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 23.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ВІС банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 21.10.2020 в 11.00

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 100939.982

Извещение о проведении 30 сентября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД»

Предмет торгов
Капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-4893 общей площадью 633,4 кв. м (наименование: здание гостиницы, мотелей, кемпингов; составные части и принадлежности: пешеходная дорожка – 251 кв. м; отмостка – 32 кв. м; бордюр 0,08 – 42,5 п. м; ограждение; ворота (а, б); калитка (в, г)); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027655 общей площадью 18,3 кв. м (наименование: хозяйственно-питьевая водопроводная сеть); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027656 общей площадью 223,0 кв. м (наименование: кабельная линия 0,4 кВ); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027657 общей площадью 34,8 кв. м (наименование: хозяйственно-бытовая канализационная сеть); многолетние зеленые насаждения: ель колючая (дерево); ель колючая (дерево); обыкновенный (55 кв. м) газон; гортензия (кустарник); тамарисник (8 кв. м) цветник; обыкновенный (67 кв. м) газон; сосна жесткая (кустарник); эригерон (32 кв. м) цветник; сирень обыкновенная (кустарник); летние (8 кв. м) цветник; гортензия (кустарник)
Сведения о земельном участке:
площадь – 0,1024 га, кадастровый номер – 500000000001000367
Местонахождение: г. Минск, ул. Щербакова, 36
Начальная цена: 647 136,61 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 64 700,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД», ул. Бауманская, 6, 220070, г. Минск.
Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает возмещение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результатного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (установленной формы), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 календарных дней с момента проведения аукциона при условии оплаты вознаграждения за организацию и проведение торгов.
Оплата приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Торги проводятся **30 сентября 2020 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.09.2020 по 25.09.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 398-96-47.
Телефоны для справок:
(017) 398-96-47 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 398-96-47 (ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД»).

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Кудрицино, дер. Прилепская Усяжка, дер. Прилепы, дер. Высокая Горка, ул. Зеленая, дер. Малое Залужье, участок № 16 Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Кудрицино	624883004801000123	0,1250	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	20000
2	дер. Прилепская Усяжка	624883008201000124	0,1230	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	12000
3	дер. Прилепы	624883008301000541	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	30000
4	дер. Высокая Горка, ул. Зеленая	624883002101000090	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	10000
5	дер. Малое Залужье, участок № 16	624883006601000149	0,1437	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	10000

Аукцион состоится 22 октября 2020 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний.
Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/**, Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by.**

Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Играй с BAMBOLINA»

1. Организатор и заинтересованное лицо рекламной игры.
Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Минт финд» (далее именуемое «Организатор»), 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, пом. 22, этаж 5, комн. 506, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192465627, свидетельство о государственной регистрации выдано 16.02.2016 г.
Заинтересованное лицо рекламной игры: Совместное общество с ограниченной ответственностью «Оазис Груп», 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Нахимова, 1, комн. 5.
2. Наименование рекламной игры – «Играй с BAMBOLINA».
3. Территория проведения – Республика Беларусь. Приобрести Игровой продукт можно в любых объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь, реализующих Игровой продукт.
4. Срок начала рекламной игры – 10 октября 2020 года, срок окончания – 25 января 2021 года.
5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:
Председатель:
Николаева Ирина Анатольевна, директор ООО «Минт финд»;
Члены комиссии:
Шкутко Мария Николаевна, менеджер по маркетингу ООО «Оазис Груп»
Николаева Ирина Анатольевна, директор ООО «Минт финд»;
Бука Светлана Анатольевна, ведущий специалист по маркетингу ООО «Минт финд»;
Каледа Юлия Николаевна, главный бухгалтер ООО «Эффективное Продвижение»;
Лелес Маргарита Александровна, заместитель директора по стратегическому развитию и планированию ООО «Эффективное Продвижение».
6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:
рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (далее по тексту Правил – Игровой продукт):

1	Пюре из груш для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 90 г
2	Пюре из яблок для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 90 г
3	Пюре из яблок и банана для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 90 г
4	Пюре из персиков и яблок для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA», 90 г
5	Пюре из яблок со сливками для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA», 90 г
6	Пюре из капусты брокколи для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
7	Пюре из тыквы для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
8	Пюре из цветной капусты для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
9	Пюре из кабачков для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
10	Пюре морковное для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
11	Пюре из яблок для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
12	Пюре из груш гомогенизированное стерилизованное для детского питания для детей раннего возраста т. з. «BAMBOLINA» 100 г
13	Пюре из абрикосов для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
14	Пюре из банана для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
15	Пюре из персиков для детского питания для детей раннего возраста гомогенизированное, стерилизованное т. з. «BAMBOLINA» 100 г
